Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 21 1933 г. № 63 (4607)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сёньня адкрываецца першы Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў

ДЭЛЕГАТАМ УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ— ПЕРАДАВЫМ БАЙЦОМ ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ КАЛГАСЫ— ГАРАЧАЕ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ



„Калі сялянская гаспадарка можа разьвівацца далей, неабходна моцна забясьпечыць і далейшы пераход, а далейшы пераход нямінуча заключаецца ў тым, каб найменш выгодная і найбольш адсталая, дробная, абасобленая сялянская гаспадарка, паступова аб'яднаючыся, з'арганізавала грамадзкую буйную зямляробчую гаспадарку. Так уяўлялі сабе ўсё гэта сацыялісты заўсёды. Іменна так глядзіць і наша камуністычная партыя"

ЛЕНІН.

ЗЬЕЗД УДАРНІКАЎ КАЛГАСНЫХ ПАЛЁЎ

Сёньня адкрываецца першы ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Лепшыя прадстаўнікі лепшых калгасаў Савецкай Беларусі, ударнікі сацыялістычнага зямляробства намецяць на гэтым зьезьдзе практычныя шляхі і сродкі для замацаваньня і далейшага разьвіцьця перамог калгаснага ладу, для забесьпячэньня поўнага посьпеху першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі.

Роўна месяц назад закончыў свае работы першы ўсесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Гістарычнае значэньне гэтага зьезду заключаецца ў тым, што, падводзячы вынікі калектывізацыі, ён намеціў ясную і выразную праграму барацьбы за далейшае арганізацыйнае, гаспадарчае і палітычнае ўмацаваньне калгасаў. Гэта праграма асабліва ярка выяўлена ў прамове тав. Сталіна і ў адозьве зьезду да ўсіх калгасьнікаў Саюзу ССР.

Шлях калгасаў—адзіна правільны шлях. Усякі іншы шлях вядзе не наперад, а назад, да адвечнай галечы, кулацкай кабалы, цемры і забітасьці. У рэзультаце калектывізацыі мільённыя масы беднякоў падняліся да ўзроўню сераднякоў, ператварыліся ў забясьпечаных людзей. А цяпер калгаснае сялянства ў цэлым—і былыя беднякі, і былыя сераднякі— павінна зрабіць наступны крок—узьняцца да ўзроўню заможных. Гэта справа не далёкага будучага, а бліжэйшых гадоў. Яна цалкам у руках саміх калгасьнікаў.

«Варта толькі палепшыць скарыстаньне машын і трактараў, варта толькі палепшыць арганізацыю зямлі, і мы дабʼемся таго, што павялічым колькасьць нашых прадуктаў удвая, утрая. А гэта ва ўсім давоўі для таго, каб зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі працаўнікамі калгасных палёў» (СТАЛІН).

«Ад вас,—гаварыў тав. Сталін, звараючыся да дэлегатаў усесаюзнага калгаснага зьезду,—патрабуецца толькі адно—працаваць сумленна, дзяліць калгасныя даходы па працы, берагчы калгаснае дабро, берагчы трактары і машыны, устанавіць добры догляд каня, выконваць заданьні вашай рабоча-сялянскай дзяржавы, умацоўваць калгасы і вышыбаць вон з калгасаў прапешых туды кулакоў і падкулачнікаў».

Вось канкрэтная праграма дзеяньняў для кожнага вясковага камуніста і беспартыйнага калгасьніка-актывіста, дакная правадыром нашай партыі, правадыром сусьветнага пралетарыяту, першым ударнікам-калгасьнікам. А самі дэлегаты ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў так вызначылі новыя задачы калгасаў у сваёй адозьве да ўсіх калгасьнікаў СССР:

«Трэба зараз-жа па-сапраўднаму ўзяцца за навядзеньне строгага гаспадарчага парадку ў нашых калгасах і на калгасных палёх. Прышоў час сур'ёзна ўзяцца за ўстанаўленьне цьвёрдай працоўнай дысцыпліны, выкараніць подыбніцтва і прагулы сярод калгасьнікаў. Трэба ўзьняць самую жорсткую вайну супроць безгаспадарчасьці, шкодніцтва, пакраж у калгасах, за ўмацаваньне калгаснай уласнасьці».

Наш рэспубліканскі зьезд павінен зьявіцца важнейшым этапам у рэалізацыі пастаноў усесаюзнага зьезду прыстасоўна да ўмоў БССР, абагуліўшы пры гэтым вопыт прайшоўшых раённых зьлётаў калгасьнікаў-ударнікаў.

Калектывізацыя і ў БССР атрымала буйнейшую перамогу. У нашай рэспубліцы калгасамі ахоплена 42 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак—51 проц. пасеўнай плошчы. Асноўная маса калгасаў БССР налічвае ня больш 2 год існаваньня. Але ўжо зараз усе выгады і перавагі калгаснай працы даказаны з усёй наглядпасьцю. Толькі ўступіўшы на калгасны шлях, разграміўшы пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі, кулацтва, асноўныя масы сялянства, якія вялі раней мізэрнае існаваньне, знаходзіліся ў пастаяннай кулацкай кабале, выйшлі на шырокую дарогу новага жыцьця.

У нас ужо нямала калгасаў, якія дабіліся буйнейшых посьпехаў ва ўмацаваньні сваёй гаспадаркі, ва ўзьняцьці ўзроўню дабрабыту калгаснай масы і якія па-бальшавіцку падрыхтаваліся да вясны.

Вось калгас «БАЯВІК», у мінулым вёска Пухава. Раней пукаўскія батракі і беднякі працавалі на паноў Рэвінскіх, атрымліваючы па 7 кап. у дзень. «Ня жыцьцё гэта было, а пекла,—успамінае калгасьніца Давідоўская Лізавета, якой ужо стукнула 60 год,—задарма я працавала на паноў, а потым на кулакоў. Апошнюю карову прадала, каб паставіць хаціну. За мінулы год Лізавета з сям'ёй выпрацавала 930 працадзён і атрымала каля 100 пуд. збожжа. На 5 чалавек гэта больш чым даволі. Гэта апроча іншых прадуктаў і грошай.

А вось калгас «Чырвоны сьцяг», Аршанскага раёну. У 1931 годзе калгасьнікі зьнялі з аднаго гэктара па 6—6,5 цэнтн збожжа, 85 цэнтн. бульбы, гародніны ня больш як па 115 цэнтн. А ў 1932 годзе, з тэй-жа самай зямлі, на якой у аднаасобнікаў раней нічога не радзіла, сабралі збожжа па 11 і больш цэнтнэраў з гэктара, ячменю нават па 17 цэнтнэраў, а бульбы—120, буракоў 200 цэнтнэраў і капусты—250 цэнтн. На адзін працадзень прыпадае 2,25 кгр. жыта, 1,7 кгр. ячменю, 1 кгр. аўса, 0,4 кгр. пшаніцы, 11 кгр. бульбы, 1,5 кгр. капусты і 1 р. 50 кап. грашыма. Калгасьнікі ня толькі забясьпечылі сябе прадуктамі, але маюць і пішкі і прадалі дзяржаве 50 пудоў збожжа.

Такіх вынікаў яны дабіліся дзякуючы добрай апрацоўцы глебы, вывазцы гною, мінэральнага ўгнаеньня, добраму догляду пасеваў. Калгас падрыхтаваўся да сяўбы. Насеньне ссыпалі датэрмінова, звыш пляну. Для рабочай жывёлы на ўвесь час пасеўнай загатоў пены кармы.

Калгас «ЧЫРВОНЫ БАЕЦ», Менскага раёну, на 37 гаспадарак мае 450 га зямлі. Ад дзяржавы атрымалі 1.000 пудоў мінэральнага ўгнаеньня, шмат машын, 2 бульбакапалкі, касарку і інш. Клопаты дзяржавы забясьпечылі павышэньне ўраджаю. Калгас поўнасьцю здаў дзяржаве вызначаную колькасьць збожжа па загатоўках. Ссыпаны і адбартаваны насенны і страхавы фонды. Апрача таго кожны калгасьнік ня толькі мае збожжа да новага ўраджаю, але атрымаў магчымасьць прадаваць дзяржаве пішкі. Коні калгасу ўзорныя. На стайню выпучылі лепшых ударнікаў Мачальскага і Вашкевіча.

Калгас «ЧЫРВОНЫ ГАЙ», Барысаўскага раёну. За тры месяцы калгасьнікі пабудавалі стайню на 80 коняй, рымарню, кузьню, сьвіран, клюб. Насенныя фонды поўнасьцю ссыпаны. Па некаторых культурах плян перавыкананы. Замест 58 цэнтн. ячменю ссыпалі 80. Бульбы ссыпалі на 16 цэнтн. больш, пшаніцы на 5 цэнтн. Насеньне хаваецца ў новым, добра прыстасаваным сьвірне. У новай кузьні, пабудаванай калгасам, скончан рамонт плугоў. Конскае паганоўе перапана ў рукі праверанных людзей—калгасьнікаў-ударнікаў. З 62-х коняй толькі 10 пастаўлены на папраўку. Рэшта—зусім працаздольныя. Коні забясьпечены кармамі.

Калгас «ЧЫРВОНЫ ТРУДАВІК», Стародароскага раёну. Ад садоўніцтва і гародніцтва калгас атрымаў летась 38 тыс. руб. даходу. Качаны капусты важылі па 30 фунтаў.

Калгас «БАЯВІК», Капыльскага раёну. 4 брыгады калгасу зараз актыўна рыхтуюцца да сяўбы. Брыгадзіры рупяцца аб кожнай дробязі. Яны загадзя рыхтуюць аглоблі, папіцы, на выпадак паломкі, каб гэтыя «дробязі» не пераашкодзілі ў рабоце. Да кожнай брыгады прымацоўваецца інвэнтар. Коні замацаваны за брыгадамі яшчэ з восені. Каваль Цвырко, дэлегат усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, ня хыкнаў аб недахваце жалеза. Ён зьбіраў па ўсіх кутках калгасу старыя акладні, ка валкі. Пакуль ехаць на зьезд, плугі ўжо былі гатовы.

Калгас выхаваў новы актыў, не адзін дзесятак ударнікаў-калгаснай будоўлі. Старшыня калгасу Давідоўскі Гаўрыла —50-гадовы стары, з гаспадарчым вопытам. Ні аднаго мерапрыемства ён не праводзіць без ухвалы калгаснага сходу. Брыгадзіры—верная апора праўленьня.

Гэтыя калгасы паказваюць узоры бальшавіцкай барацьбы за ўмацаваньне калгаснага ладу. Яны непасрэдна падышлі да ажыцьцяўленьня задачы ўзьняцьця калгаснай масы на ўзровень заможных.

Недарма посьпехі калектывізацыі ў БССР знайшлі такі гарачы водгук сярод зруйнаваных сялянскіх мас Заходняй Беларусі, дзе галеча ў вёсцы дайшла да таго, што сялянину няма за што нават сопі купіць, што ён дзеля эканоміі запалак расчапляе на некалькі частак, а ад ужываньня газы даўно адмовіўся, замяніўшы яе старажытнай лучынай. Хіба-ж не паказальна, што ў Заходняй Беларусі ўжо адзначана некалькі выпадкаў звароту груп сялян з хадайніцтвам аб дазволе арганізацыі калгасу?

Ва ўсім капіталістычным сьвеце сельская гаспадарка перажывае зараз страшэнны ўпадак, сялянскія масы асуджаны на зруйнаваньне і голад, і толькі ў нашай краіне, дзякуючы калектывізацыі, адбываецца няўхільны ўздым сельскай гаспадаркі і нлўхільны рост дабрабыту працоўных сялянскіх мас, якія раней знаходзіліся на грані галечы.

Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў зьбіраецца напярэдадні веснавой сяўбы. Гэта сяўба павінна адыграць рашаючую ролю ў далейшым разьвіцьці калектывізацыі ў БССР, яна павінна прынесьці новыя перамогі калгаснаму ладу.

Зьезд павінен мабілізаваць усю калгасную масу на бальшавіцкае правядзеньне сяўбы, на выкананьне ўсяго пасеўнага пляну ў найкарацейшы тэрмін, на заваяваньне ў гэтым годзе высокага ўраджаю па ўсіх культурах. Калгасы, адстаўшыя ў зборы насеньня, у скончэньні рамонту інвэнтару, у падрыхтоўцы жывой цягавай сілы, у арганізацыі ўсіх пасеўных работ, павінны ў бліжэйшыя дні нагнаць прапушчаны час. Зараз дарагі кожны дзень, кожная гадзіна.

Веснавая сяўба—наш галоўны бой з антыкалгаснымі элемэнтамі, з кулаком, з усімі ворагамі калгасаў. Каб выйграць гэты бой, трэба дзейнічаць так, як да гэтага заклікаў усесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

«Кожны сумленны калгасьнік, кожны ўдарнік павінен адказваць ня толькі за сябе аднаго, а прынамсі за дзесятак сваіх бліжэйшых суседзяй, таварышоў па рабоце. Толькі тады, калі ён, сумен на працуючы сам, дабʼецца таго, што вакол яго другія дзесяць будуць таксама сумленна працаваць, толькі тады, калі ён бязьлітасна будзе выкрываць шкоднікаў, кулакоў, жулікаў, ворагаў, злосных прагульшчыкаў і здолее ўзьняць супроць іх другіх сумленных калгасьнікаў, а ня будзе маўчаць, ня будзе глядзець на ўсе агіднасьці скрозь пальцы,—толькі тады ён будзе мець права насіць ганаровую назву ўдарніка, толькі тады дабʼецца ён посьпеху, толькі тады не загіне дарма праца ўдарніка».

Вялікае значэньне для БССР маюць указаньні тав. Сталіна аб адносінах калгасьнікаў да аднаасобнікаў. Мы не павінны забываць, што ў нас у калгасах абʼяднана 42 проц. усіх гаспадарак, а па-за калгасамі яшчэ знаходзіцца 58 проц., г. зн. большасьць гаспадарак. Аднаасобны сэктар займае яшчэ вельмі вялікае месца ў сельскай гаспадарцы нашай рэспублікі. Наша задача заключаецца ня толькі ў тым, каб забясьпечыць поўны посьпех сяўбы ў калгасах, але і мабілізаваць на выкананьне пасеўных пляноў усе аднаасобныя бядняцка-сераднякіх гаспадаркі.

Кулак разьбіт, але яшчэ не дабіт, ён вельмі выкрутлівы, ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі ён часта-густа карыстаецца фальшыва-нацыянальным сьцягам, каб маскаваць сваю падрыўную работу.

У перыяд сельска-гаспадарчых загатовак высьветлілася, да якой ступені многія нашы калгасы засьмечаны кулацкімі і іншымі антысавецкімі элемэнтамі. Ачыстка калгасаў ад ворагаў калгаснага ладу далёка яшчэ не закончана, і абавязкам кожнага калгасьніка-ударніка зьяўляецца рашучая барацьба за выгнаньне з калгасаў усіх чужых і варожых элемэнтаў, якія там угнязьдзіліся.

Рэспубліканскі зьезд ударнікаў сацыялістычнага зямляробства, які сабраўся напярэдадні веснавой сяўбы, на аснове пастаноў усесаюзнага калгаснага зьезду і ўказаньняў улюбёнага правадыра пралетарскіх і калгасных мас тав. Сталіна, —забясьпечыць перамогу першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі. Зьезд павінен папажыць пачатак магутнаму сацыялістычнаму спаборніцтву калгасных мас у выкананьні задач арганізацыйнага, гаспадарчага і палітычнага ўмацаваньня калгасаў, у барацьбе за ператварэньне іх ва ўзорныя, высока-таварныя і высока-даходныя гаспадаркі.

Няхай жывуць ударнікі калгасных палёў!

„Цяпер пытаньне стаіць ужо не аб тым—быць ці ня быць калгасам,—гэта пытаньне ўжо вырашана станоўча. Калгасы замацаваны і шлях да старой аднаасобнай гаспадаркі закрыт канчаткова. Цяпер задача заключаецца ў тым, каб умацаваць калгасы арганізацыйна, вышыбіць адтуль шкодніцкія элемэнты, падабраць сапраўдныя праверныя бальшавіцкія кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі. У гэтым цяпер галоўнае".

СТАЛІН.

ДЭЛЕГАТЫ ПРЫЕХАЛІ

На пэроне рабочыя друкарні імя Сталіна, прадстаўнікі чырвоناармейскіх часьцей.

Чакаюць дэлегатаў. Едуць! Едуць!! Грымець аркестр. Махаюць шапкамі з пэрону. Вусны старой калгасьніцы разьбягаюцца ў шырокую прывітальную ўсьмешку. Яна звонка сьмяецца.

— Ой, колькі людзей! — вырываюцца ў яе словы здзіўленьня і радасьці. І крыху счакаўшы, яна, дойчыцца а калгасу Тураўшчыны, расказвае наборшчыцам і вярстальшчыцам друкарні, як яны, дэлегаты, даехалі, як радаваліся, што атрымалі дэлегацкі мандат.

— Як толькі сказалі на станцыі, што мы дэлегаты, нам і білет без чаргі, прасторны вагон.

Знаёмяцца майстры друкаванага слова з майстрамі калгасных палёў.

— Я машыніст,—гаворыць стараваты рабочы, працягваючы руку сівому калгасьніку. Той бярэ руку, трымае некаторы час, моцна цісьне, потым сур'ёзна пытае:

— На цягніку, значыць, служыш?

— Не, у друкарні.

— Гэта, дзе кніжкі робяць?

— Так, кніжкі, газэты.

— Вокладкі дробныя робіце, — заключае калгасьнік. — Як замалюеце на другой кніжцы, дык і не зразумеешнічога.

Затым калгасьнік называе сябе.

— Я брыгадзірам працую ў калгасе імя Калініна.

І майстра з калгасу імя Калініна расказвае, як чакаюць калініцы вясну, як яе сустракаюць, карміліцу. Машыніст слухае, устаўляе свае заўвагі. І яны, удвох, абодва сівыя, абмяркоўваюць пытаньні, як старыя знаёмыя, як добрыя прыяцелі, хоць і забачыліся сёньня ў першыню.

***

У залі вакзалу рабочыя частуюць гарбатай дэлегатаў з Лельчыц, Ельску, Турава і Жыткавіч. Работніцы акружылі жанчын-дэлегатак. Іх тут многа.

В. М.

У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ

ЧУТКІ АБ ЗАБОЙСТВЕ тав. ТЭЛЬМАНА

ЛЕНДАН, 20.

«Дэйлі экспрэс» зьмясьціў сёньня паведамленьне «Юманітэ» аб забойстве Тэльмана ў суботу 18 сакавіка і надрукаваў тэлеграму свайго ўласнага карэспандэнта ў Бэрліне, у якой паведамляе, што чуткі аб казьні Тэльмана цыркулююць па Бэрліну ўжо некалькі дзён.

Карэспандэнт піша: «Калі я папрасіў афіцыяльны ўрадавы дэпартамант друку адказаць мне пэўна «да» ці «не» на пытаньне жыў ці забіт Тэльман, то чыноўнік далікатна адмовіўся адказаць».

УДАРНІКІ ЗАВОДАЎ—УДАРНІКАМ ПАЛЁЎ

ПРЫВІТАНЬНЕ УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ АД РАБОЧЫХ ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

Паўтаратысячны калектыў рабочых, ІТР і служачых чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава шле пралетарскае прывітаньне ўсебеларускаму зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Наш завод зараз аддае шмат увагі сельскай гаспадарцы. За кароткі тэрмін мы асвоілі выпуск запасных частак да трактараў. Дзякуючы ўпартым намаганьням усяго заводзкага калектыву заказы сацыялістычнай сельскай гаспадаркі на запасныя часткі і на рамонт трактараў нами выкананы датэрмінова.

Зараз увага ўсёй грамадзкасьці нашага заводу прыкавана да пралетарскага шэфства над вёскай, да брацкай дапамогі калгасьнікам у падрыхтоўцы і правядзеньні сяўбы.

З такой-жа ўпартасьцю і бальшавіцкай энэргіяй, як змагаліся мы за асваеньне і выраб запасных частак, працуйце і вы, таварышы калгасьнікі.

Мацуйце калгасны лад, беражоце калгаснае дабро. Бязьлітасна выкрывайце кулакоў, лодыраў і гультаёў. Гапеце іх з калгасаў.

Наш галоўны бой — бой за пераможнае правядзеньне першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі, мы павінны выйграць ва што-б там ні стала.

Няхай жыве першы ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў!

Няхай жыве камуністычная партыя — арганізатар і кіраўнік вялікай сацыялістычнай будоўлі!

Няхай жыве правадыр вялікага калгаснага руху — першы калгасьнік-ударнік тав. Сталін!

Няхай жыве КП(б)Е на чале з тав. Гікало!

Ад імя рабочых заводу імя Варашылава:

СОСІНАЎ—сакратар парткалектыву,
ДЗІЧКОЎСКІ—дырэктар заводу,
КОЎБАН — старшыня заўкому.

СЁНЬНЯ, у 7 гадзін увечары, у доме КУЛЬТУРЫ (Яўрэйскі тэатр)
АДКРЫВАЕЦЦА
ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД
КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Члены ЦК і ЦКК праходзяць па сваіх пасьведчаньнях, іншыя па выданым білетам.

АРГКАМІСІЯ

Фото Гурвіча Г.

НА ЗДЫМКАХ ДЭЛЕГАТЫ ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ - УДАРНІКАЎ. 1) ТАВ. ЧЫМАНСКІ—СТАРШЫ МЭХАНІК БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ МТС; 2) ТАВ. КАСЬЦЯНКОВА—КАЛГАСЬНІЦА КАЛГАСУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, ГОРАЦКАГА РАЁНУ; 3) ТАВ. ПУГАЧ—СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНАЯ УКРАІНА», КАМАРЫНСКАГА РАЁНУ; 4) ТАВ. АРОНАЎ—СТАРШЫНЯ ЯЎРЭЙСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАЛГАСУ «НОВЫ ШЛЯХ», ГОРАЦКАГА РАЁНУ; 5) ТАВ. КАЖЭУНІКАЎ—КАЛГАСЬНІК КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ», БУДАКАШАЛЕЎСКАГА РАЁНУ; 6) ТАВ. ПРЫХОДЗЬКА — КАЛГАСЬНІК КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ», КАМАРЫНСКАГА РАЁНУ і 7) ТАВ. ЛУКАШКОВА — КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА, ГОРАЦКАГА РАЁНУ.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

„НАША БЛІЖЭЙШАЯ ЗАДАЧА—ЗРАБІЦЬ

ЯШЧЭ АБ КІРАЎНІЦТВЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКАЙ

Тую суровую крытыку і тыя зусім канкрэтныя ўказаньні ў частцы кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, якія даны тав. СТАЛІНЫМ у яго прамове аб рабоце ў вёсцы, некаторыя работнікі і пасобныя мясцовыя кіруючыя органы схопілі на паўтараюць на ўсялякіх сходах, у доўгіх рэзалюцыях, але працуюць усё яшчэ па-старому. Такая «ліпучасьць», зьяўляючыся АДНЭЙ З НЕБЯСПЕЧНЕЙШЫХ РОЗНАВІДНАСЬЦЯЙ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ НА ПРАКТЫЦЫ, становіцца шырмай, за якой беспакарана могуць тварыць свае агідныя злачынствы контр-рэвалюцыйныя, кулацкія, шкодніцкія элемэнты. Таму іменна да пытаньняў кіраўніцтва сельскай гаспадаркай прыходзіцца вярнуцца зноў і зноў.

У чым сутнасьць новых патрабаваньняў, якія прад'яўляюцца партыйным арганізацыям у частцы кіраўніцтва вёскай?

«Пакуль у вёсцы пераважаў аднаасобны гаспадар, партыя магла абмяжоўвацца сваё ўмяшаньне ў справу разьвіцьця сельскай гаспадаркі пасобнымі актамі дапамогі, парады або папярэджаньня»—гаворыць тав. Сталін у прамове на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК «Аб рабоце ў вёсцы». А ў цяперашніх умовах, пры пакіданьні ў сельскай гаспадарцы саўгасаў і калгасаў, «партыя ўжо ня можа цяпер абмяжоўвацца асобнымі актамі ўмешваньня ў працэс сельска-гаспадарчага разьвіцьця. Яна павінна цяпер узяць у свае рукі кіраўніцтва калгасамі, прыняць на сябе адказнасьць за работу і дапамагчы калгаснікам весьці сваю гаспадарку наперад на аснове даных навукі і тэхнікі» (СТАЛІН).

ПРЫНЯЦЬ НА СЯБЕ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА РАБОТУ—ВОСЬ У ЧЫМ СУТНАСЬЦЬ. А Ў НАС ЯШЧЭ ЧАСТА ЗНАХОДЗЯЦЦА ТАКІЯ ЛЮДЗІ, ТАКІЯ КІРАЎНІКІ, ЯКІЯ АБ ГЭТАЙ АДКАЗНАСЬЦІ І СЛУХАЦЬ НЯ ХОЧУЦЬ.

Узяць для прыкладу хоць-бы тое, што адбылося з законам аб устойлівым зямляканарыстаньні калгасаў. Паўгода прайшло з часу апублікаваньня гэтага дэкрэту, які мае выключна важнае значэньне для справы ўмацаваньня калгасаў. І што-ж выяўляецца? Знайшліся людзі, людзі адказныя, якія, як відаць, вырашылі справу проста: дэкрэтам калгасы і калгаснікі здавалены, а чаго-ж трэба больш?

І патрэбна было спецыяльнае ўмяшаньне Цэнтральнага камітэту, падаенае намі ў нумары «Праўды» ад 17 сакавіка, каб прымусіць Наркамзем СССР і яго мясцовыя органы сур'ёзна заняцца ажыцьцяўленьнем дэкрэту аб устойлівым зямляканарыстаньні калгасаў.

Мы спыніліся толькі на адным выпадку разрыву паміж словамі і справай, выпадку, паўтоўна на вартым бальшавіцкай, бо тав. Сталін на раз падкрэсьлівае, што ў БАЛЬШАВІЦКОЙ СЛОВА НЕ РАЗЫХОДЗІЦЦА СА СПРАВАЙ. Але калі зьвярнуцца і да іншых фактаў, калі, у прыватнасьці, азнаёміцца з дзьвюма іншымі пастановамі ЦК, падаенымі намі ў тым-жа нумары «Праўды» ад 17 сакавіка, то і гэтыя факты гавораць пра-тое-ж. І пастанова ЦК аб ходзе рамонту трактараў і пастанова ЦК аб праверцы на месцы сьведчэньняў аб тым, што на тысячы ў раённых і абласных установах, але і ў некаторых нашых наркаматах усё яшчэ панае агульных разважаньняў аб канкрэтным кіраўніцтве і пакуль што мала сапраўды канкрэтнага кіраўніцтва.

А пытаньне гэта вялікае, пытаньне кардынальнае, пытаньне рашаючае, бо «КАЛІ МЫ НЯ КІРУЕМ У ТЫХ ЦІ ІНШЫХ КАЛГАСАХ, ТО ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО ІМІ КІРУЮЦЬ АНТЫСАВЕЦКІЯ ЭЛЕМЭНТЫ» (СТАЛІН). Пытаньне аб кіраўніцтве сёньня стаіць так: АБО бальшавіцкія, АБО антысавецкія калгасы, бо пры абвостраній клясавай барацьбе сярэдзіны няма і быць ня можа. Усе мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі, якія лічаць, што яны абапяраюцца толькі «папітычнае кіраўніцтва, не разумеюць самага істотнага. Яны не разумеюць, што папітычнае кіраўніцтва заключаецца сёньня ня ў тым, каб, гаворачы словамі тав. Сталіна, гаварыць трохаршынныя прамовы, а ў ДЗЕЛАВОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ЗБОРУ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ, У ДЗЕЛАВОЙ АРГАНІЗАЦЫІ РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ, У ДЗЕЛАВОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ХАВАНЬНЯ, ПЕРАВОЗКІ І ПРАТРУЧВАНЬНЯ НАСЕНЬНЯ, У ДЗЕЛАВОЙ ДАПАМОЗЕ КАЛГАСАМ ПРЫ СКЛАДАНЬНІ ПЛЯНАЎ, ФАРМАВАНЬНІ БРЫГАД І Г. Д.

ПРЫНЯЦЬ НА СЯБЕ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА ЎСЮ ГЭТУ РАБОТУ—вось чаго патрабуе цяпер партыя ад кожнага камуніста, ад кожнай партыйнай і савецкай арганізацыі.

Тав. КАГАНОВІЧ на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК і потым на першым усесаюзным зьезьдзе калгаснікаў ударынкаў, канкрэтызуючы праграмныя ўказаньні тав. СТАЛІНА аб рабоце ў вёсцы, паказаў, як павінен працаваць і кіраваць сапраўдны бальшавік. Спусьціцца ў самыя глыбіні калгаснага жыцьця, калгаснай вытворчасьці, у стайню, у майстэрню, у брыгаду, на поле, гаспадарскім вокам ускрыць недахопы і, закасаўшы рукавы, разам з беспартыйнымі, арганізуючы іх, зьнішчыць гэтыя недахопы—вось у чым сёньня сапраўды палітычнае кіраўніцтва. А ў нас усё яшчэ некаторыя кіраўнікі сядзяць у канцылярыях і на сходах на толькі таго, што робіцца ў якой-небудзь калгаснай стайні, а тут-жа, пад іх носам, у тэй-жа канцылярыі. Гэта асабліва ясна пасьля таго, як органы АДПУ выкрылі і пакідзавалі контррэвалюцыйную шкодніцкую шайку, арудаваўшую ў некаторых органах Наркамзему і Наркамсаўгасаў, гапоўным чынам, у сельска-гаспадарчых раёнах Украіны, Паўночнага Каўказу і Беларусі.

Апарат кіраўніцтва—гэта рэч сур'ёзная. Недарма Ленін разглядаў задачу палепшэньня дзяржаўнага апарату, апарату кіраўніцтва, як адну з задач эпохі. Але гэтага ўсё яшчэ не разумеюць і ня хочуць зразумець некаторыя камуністы. Затое разумеюць гэта контр-рэвалюцыйныя, шкодніцкія элемэнты, стараючыся на тым ці іншым участку ўзяць кіраўнічы апарат у свае рукі. Такія камуністы прадстаўляюць сабой горшы від саноўніка шчодрынска га тыпу, які «дрэманым» сном нічога ня бачыць, а «недрэманым» бачыць толькі глупствы.

АПАРАТАМ ТРЭБА КІРАВАЦЬ, АПАРАТ ТРЭБА ВЕДАЦЬ, ШТОДЗЕН НА КАНТРАЛЯВАЦЬ ЯГО РАБОТУ, удумвацца ў кожную пічбу, у кожны вывад, якія дае апарат, дашукваецца, як, адкуль гэта пічба або гэты вывад узяты, праверыць першакрыніцы, а не штампаваць гатовенькае.

Пытаньне аб адказнасьці зьяўляецца цэнтральным пытаньнем КАНКРЭТНАГА кіраўніцтва, бо канкрэтнае кіраўніцтва вымагае практычных рашэньняў, а практычныя рашэньні вядуць да практычных-жа вынікаў. Гэта агульнае правіла. Што-ж датычыць канкрэтнага кіраўніцтва ў цяперашніх умовах абвостранай клясавай барацьбы, то пытаньне аб адказнасьці кожнага работніка становіцца рашаючым пытаньнем. Бо ў гэтай барацьбе ўсякае ўвільгаць на ад адказнасьці, невыкарыстаньне сваіх правоў, перакладваньне справы на другіх, чаканьне чарговых пасяджэньняў, нарад і камісій павялічваюць мажыўнасьць клясавага ворага, даюць яму магчымасьць часта хаваць канцы ў ваду.

Набліжаецца рашаючы дні праверкі ўсіх партыйных арганізацый, усіх кіруючых сельскіх гаспадарчай органаў, як на справе яны парабудавані свае работу ў духу ўказаньняў тав. Сталіна. У паўднёвых раёнах пачынаецца ўжо масавая сяўба. Гатоўнасьць да сяўбы, пасьпяховае яе правядзеньне—усё залежыць ад нас, камуністаў. Усё залежыць ад таго, наколькі даная партыйная арганізацыя ў даным раёне сапраўды ўзяла кіраўніцтва калгасамі і саўгасамі ў свае рукі, наколькі яна разумее важнасьць выкананьня пляну сяўбы і па арганізасьбным сэктары, пра які многія забываюць. Толькі ад гэтага залежыць посьпех весьнавой сяўбы: «КАЛІ ГУТАРКА ІДЗЕ АБ АДКАЗНАСЬЦІ І ВІНАВАТАСЬЦІ, ТО АДКАЗНАСЬЦЬ ПАДАЕ ЦАЛКАМ І ПОЎНАСЬЦЮ НА КАМУНІСТАЎ. А ВІНАВАТЫ ТУТ ВА ЎСІМ—ТОЛЬКІ МЫ, КАМУНІСТЫ».—гэтыя словы тав. Сталіна, сказаныя ім з позаду збожжазагатовак, цэлкам адносяцца і да надыходзячай весьнавой сяўбы.

Усьвядамляючы гэту клясавую адказнасьць, па-бальшавіцку пікідзуем усе недахопы кіраўніцтва калгасамі. Усе сілы свае аддамо на тое, каб ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ ПРАВЕСЬЦІ ЎЗОРНА І ЎСЕ КАЛГАСЫ ЗРАБІЦЬ БАЛЬШАВІЦКІМІ.

(«ПРАЗДА»).

Вал. Мядзьведзеў

ВЫЙГРАЕМ НАШ ГАЛОЎНЫ БОЙ

Мы зайшлі ў калгасны сьвіран. У сьветлым прасторным памяшканьні былой царквы па-гаспадарску зроблены засекі, расстаўлены вялікія бочкі. Усе яны напоўнены збожжам. І ня проста збожжам, а адборным зернем на насеньне. У ленным бажу ва ўсю даўжыню сьвірна разьмясьцілася засек з аўсом. Глядзіш на яго і любуешся. Чысты, буйны, каліва ў каліва. Адразу відаць, што калі яго пакідзілі гаспадарскія рукі, каб раз і на заўсёды пакончыць з сарнякамі.

Амбон, — месца былога прастолу, — заняла чорнавокая грэчка. Яна так сама павінна дзякаваць сваім гаспадаром. Ад сьвіроніцы, якая ў мінулым годзе карысталася поўнапраўем на атрыманьне глебавага харчу, сёлета яе выдзялілі.

Віка і ячмень размясьціліся тут-жа побач у адным засеку. Перагаворыўшы паміж імі служыць пустая мяжа. Бочкі расстаўлены ў правым баку сьвірна. У іх знайшлі сабе прытулак тэхнічныя культуры — лён і канопілі, а таксама проса і канюшына

Пакапаўшыся ў сьвірні стала, які сталі тут-жа ў сьвірні, кладаўшчык, малады хлапец з вялікім ключом у руцэ, дастаў адтуль шорную пашку і пачаў пералічваць упытыя ў яе паперкі. Потым падпісаў і паказаў пальцам на невялікую таблічку з лічбамі.

— Вось тут паказана ўсё: колькі нам чаго патрэбна, што ў нас ёсьць.

І запраўды, табліца сьведчыла аб поўнай ссыпцы насеннага і страхавога фондаў па кожнай культуры асобна. Таблічка падпісана самім кладаўшчыком аб прыняцьці ім збожжа на захаваньне да веснавой сяўбы.

Калгас ссыпаў насеньне яшчэ ў пачатку сімы, зараз-жа пасьля выканаць ня абавязкаў перад дзяржавай. Вартаўнік і кладаўшчык добра ведаюць, што азначае для калгасу насеньне, а таму ахоўваюць яго, як ураснае вока.

Калгас «Рэвалюцыя» падрыхтаваўся да сяўбы ня толькі адным насеньнем. С.-г. інвэнтар і збруя таксама ў поўнай гатоўнасьці. Плугоў адрэмонтавана 42, а патрэбна 36. 6 плугоў лічацца ў запасе. У выпадку псаваньня ў часе работы, можна будзе хутка завяпіць спраўным. Вазоў і боран таксама хапае. Увесь інвэнтар адрэмонтаван тут-жа, у калгасной кузьні, рукамі кавалёў-калгаснікаў.

24 пары коняй і 12 пар валоў выцілі на вясну зусім здаровымі і сытнымі. Корму ў калгасе хапае. На час геснавых палявых работ складзен фуражны фонд: 760 цэнтн. канюшины, цімафееўкі і сена і 82 цэнтн. аўса.

Адзак, справа ня толькі ў кармах. Рашаючым зьяўляецца погляд жывёлы. У калгасе «Рэвалюцыя» ні адкаго абязьлічанага каня і вала вы ня знойдзеце. Мала таго, уся цягавая сіла разьмяркавана па брыгадах. Коні і валы замацаваны за асобнымі калгаснікамі ўнутры брыгад. І ня толькі коні і валы, але інвэнтар і збруя.

Сёлета ў калгасе арганізаваны тры пастаянныя паляводчыя брыгады. Усе яны ведаюць свае вучасткі, і якія культуры на іх будуць сеяць. Кожная брыгада мае свой вытворчы плян.

Складзен і севазварот. У гэты час калгас сустроўся з некаторымі труднасьцямі, з прычыны таго, што зямельная плошча вельмі раскідана. У брыгадзе № 3, якая складаецца з калгаснікаў асобнага пасёлку, прышлося ўвесьці свой пяцідольны севазварот.

Такім чынам, насеньне, інвэнтар, зямля, коні, людзі — усё гатова да галоўнага бою — за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы. Гэты бой калгасам «Рэвалюцыя» будзе выйгран. Выйгрыш забясьпечан яшчэ і таму, што прапоўная дысцыпліна сярод калгаснікаў значна ўзмацнілася. Брыгадзір брыгады № 2 Капіч Фядос расказвае, што, калі раней яму прыходзілася хадзець па хатах і прасіць, каб ішлі на работу, дык зараз не пасьнее яшчэ разьвіднець, як усе калгаснікі сядуць і патрабуюць работы.

Добры і штаб кіраўніцтва ў калгасе, на чале са старшынёй т. Карпейчыкам — былым батраком, членам партыі, які дужо хварэе за работу ў калгасе. Калгаснікі ў ім бачаць сапраўднага кіраўніка і арганізатара.

Франоў.

Калгас «Рэвалюцыя», Ельскі раён.

МОНУС МІРКІН

Дэлегат ад нацыянальнага калгасу „Ўсход"

МАЯ ДАРОГА

Голь перакатная, некалькі самых бяднацкіх яўрэйскіх гаспадарак з былой Маляціцкай воласьці арганізавалі ў 1918 г. камуну. Назвалі яе «Расьсьвет». На папоўскім залесьсі, на памежнымскіх аблогах і толькі на невялікім кавалку выпрацаванай зямлі селі мы, яўрэйская беднота, гаспадарыць.

Цяпер нават ня ўзважыш усяго, як было нам цяжка. У першую вясну нашага камунарскага жыцьця расьцерабілі мы першыя дзьве дзесяціны і пасеялі на іх ярыцу. Потым набудавалі адну хату. Пасяліліся ў ёй усёй камунаю. Праз некаторы час пераехалі на поле з мястэчка Маляціч маю хатку. Стала ў нас ужо дзьве жылыя будынкі. Стаялі яны адзінокія на далёкіх узлесках, пустыя, нязграбныя.

Замою будаваліся. Лес быў свой. Дзень у дзень ехалі. На вялікіх марозах грэліся камунарскай напорлівасьцю, галопцы лі адганялі камунарскай упэўненасьцю ў лепшым будучым

Маляціцкія кулакі і пэпманы, стрэмаўшы і клерыкалы адкрыта пагражалі нам жорсткай расправай. Некалькі разоў прыходзілі да нас кулацкія дэлегацыі і заяўлялі:

— Кіньце, Міркіны, буцаваціца. Нечапайце гэтага лесу. Не пазьней, як праз месяц чырвоныя ўцякуць, тады, даведзецца вам гэтыя бярвеньчыкі на плячох насіць ды ў лесе ў зямлю тыкаць. Зьдзірам тады з вас па сем скур.

У камуне было нас тры браты, апрача іншых камунараў, і вядома, больш за ўсё нападалі на нас, на Міркіных, ды на арганізатара камуны тав. Якава Чарнідоўскага.

А чуткі ўсялякія на нас наступалі. Травілі і тапталі нашы пасевы, вырывалі наш малады сад. Загоніш, бывала, вясковых коняй у сваю пушчу, каб за патраву ўзяць, а кулацкая банда прыдзе, паламае дзьверы, выпусьціць усю жывёлу ды яшчэ жаўмысьліць па пасевах прагоніць. Некалькі разоў даводзілася паноты ў сельсавет ехаць, шукаць там падтрымальны і дапамогі. Часам было так нізка, так цёмна, што здаецца вось-вось патухне наш «Расьсьвет». Сем гаспадарак ня выпрымалі — уцяклі ад труднасьцяй. З васьмнаццаці гаспадарак засталося нас адзінаццаць.

Урэшце-ж набудавалі такую гаспадарку, ды каб нам цяпер шмат такіх калгасаў, добра было-б. Сем год шпацаваў наш «Расьсьвет» — спачатку камунай, а потым перайшлі ў калгас. За гэты час мы вырасьлі: з васьмі худых, шарсьлівых, замуленых коняй да дванаццаці ўкормленых, прыгожых здаравякоў, маем 31 карову, 18 парсятак, а раней было толькі 6 хвостоў, не ва ўсіх былі каровы, калі запісваліся ў камуну. Ураджаю дабіліся: жыта — 130 пудоў з дзесяціны, аўса — 100 пудоў, бульбы — 900 пудоў. Пастаўлі ўсё неабходным у гаспадарцы будынкі.

Узьбіліся на добрае жыцьцё, хапала ў камунараў хлеба і ўсяго другога патрэбнага. Адным словам, зажылі так, што наша яўрэйская беднота раней гэтага нават і чакаць не адважалася.

Тады нас паклікалі ў райком партыі. Пахвалілі за нашу добрую работу. Потым пачалі гаварыць пра тое, што ў Крычаўскім гарсавеце ёсьць яўрэйскі нацыянальны калгас «Усход» і што ён ні да чаго неварты і як быць, каб яго паставіць на ногі. Усяк гаварылі, былі ўсякія думкі. Потым парашылі зрабіць так: паслаць камунараў для ўмацаваньня калгасу «Ўсход».

Пагаварылі мы, падумалі і восем гаспадарак «Расьсьвету пераехалі ва «Ўсход». Нас трое, Міркіных братоў, пераехала, такзама пераехаў Вергліб, Кручык, які цяпер старшыня «Ўсходу», і яшчэ некалькі гаспадарак.

Частку сваіх будынкаў мы перавезьлі ў новы калгас, а частку прадалі тамашняму саўгасу. Прывезьлі ўсё сваё пасеньне, прывялі кароў, коняй, жарэбятак.

Калі ў «Расьсьвеце» наступалі на нас кулакі з бакоў, дык на «Ўсходзе» нам прыйшлося, раней за ўсё, ваяваць з пэпманамі і кулакамі, якія пралезьлі ў калгас. Летась мы выкінулі з «Ўсходу» сем пэпманаў і ганьбароў, ды ў сёлетнюю вясну трох выгналі.

У леташнюю пасеўную кампанію — тады мы толькі яшчэ пераехалі ў Крычаў — наш калгас быў самым адсталым у раёне, самым ненадыхтаваным да сяўбы. За год-другі, ён так адправіўся, што стаў лепшым, перадавым і весь сёньня шле ён мяне ў Менск на Усебеларускі зьезд. Коліны-ж калгаснік ведае, якія калгасы атрымалі права пасылаць сваіх дэлегатаў.

За леташні год мы паставілі на нашай калгаснай сядзібе дзесяць пунь, пяць вялікія хаты, 80 мэтраў аборы. Ураджай у нас быў такім, што мы выканалі ўсе абавязкі перад дзяржавай, адалі пасеньную пазыку, якую бралі ў другіх, забясьпечылі сябе хлебам — тых калгаснікаў, хто працаваў.

Ва «Ўсходзе» нам ужо значна лягчэй было наладжваць гаспадарку, бо мы ў «Расьсьвеце» навучыліся, як трэба прапавадзіць у калгасе і, перш за ўсё, што ня трэба і блізка падпушчаць да сябе ворагаў і шкоднікаў. Цяпер мы добра падрыхтаваліся да сёлетняй сяўбы. Коні значна лепшыя, чым летась былі. Усякага пасеньня хапае. Зрабілі шмат новых запасных і рэзервных хамутоў. Купілі, колькі трэба, новых плугоў, калёс, баронаў ды іншых патрэбных у гаспадарцы прылад. Кожны калгаснік ведае свой плуг, свае калёсы і кажа якога ў іх запрагаць.

Я ўжо стары чалавек. Узяцку працую ня жывёлы — старэйшым даглядчыкам. Вытрымаў за год каля 400 працадзён, ды дачка 290. Атрымалі столькі хлеба і ўсялякага дабра, што хапае на ўсё, абы здароўе.

Уступку працую на полі. На сенакосе ні ўступаю самаму лепшаму касцу з маладых.

Я хачу абавязкова выступіць на зьезьдзе. Расказаць пра камуну «Расьсьвет», пра наш цяперашні калгас «Ўсход», пра тое, як мы яго направілі, пратаўны кулакоў і пэпманаў. Я хачу расказаць дэлегатам пра маю дарогу, пра дарогу трох братоў Міркіных, якія былі без хлеба пры цары, якія маюць цяпер шмат хлеба, і душа і сэрца іх ляжыць за набудову моцных і багатых калгасаў.

Крычаўскі раён.

БРЫГАДЗІР СЕРАДАЎ

Вецер ужо не сьляпіць вачэй і ня ўзьнімае завірухі сьнегу. На разьбітай дарозе ў лес выступілі чорныя плямы зямлі. Са страхі стайні казаюць апошнія кроплі. А вецер ужо цёплы, весьнавы.

У гэтыя дні, ад фальня да вечару, ходзіць па двары ад стайні да кладовай высокі, пажылы чалавек. Ён старанна аглядае коняй, робіць заўвагі конюхам, запісвае нешта на паперцы, ідзе ў кладовую, у каторы раз перагляпае збрую, нагадвае паправіць дугі і па кожным хамуце прыбіць бляшку з нумарам каня. А потым ідзе пад навесь — там рамантуюць калёсы.

Ходзіць па брыгадным двары брыгадзір Серадаў ад раньня да вечара. Аглядае ён коняй, якія раніцой ідуць у работу — возіць угнаеньне, вечакана зьяўляецца, калі здаюць конюхам коняй пасьля працоўнага дня.

Ня крычыць Серадаў, гаворыць ціха, не сьпяшаючыся.

— Ты, Шышкоў, што з канём зрабіў? Замест таго, каб два разы ў лес зьезьдзіць, па адзін воз паклаў? Добра!

— Выбачай, Іван Іваныч

— Ня мне коняй псуеш — брыгадзе.

— Я думаў, тав. брыгадзір...

— А ў абед каня не адпрагаў? Я ведаю.

— Тав. Серадаў...

— Вось і разьбіраў.

— Я ў апошні раз...

— І на разу псаваць каня не дазволім.

Насоўвае Серадаў шапку на лоб, ідзе далей. Умее ён за каня калгаснага пастаяць. Напісаў адноўны ў горадзе калгаснік Сілівонаў. Гнаў каня з прысьвістам. Шарахнуўся ў бок конь, наскочыў на дрова, забіўся. Склікаў Серадаў брыгадны сход. Выраншылі: адзаць пад суд. І атрымаў Сілівонаў 7 месяцаў прымусовых работ і 200 руб. штрафу. Украў конюх Падтагаеў Яўхім Пуд аўса — і Падтагаева адалі пад суд.

Часта гаворыць Серадаў:

— Калі справа ідзе аб калгаснай маемасьці — хоць брата, хоць свата — не пашкадую.

Добрыя коні ў 1-й брыгадзе калгасу «Расьсьвет пераможца», у брыгадзе Серадава. З 26 коняй толькі двух адносьлі да слабых, а добрых — больш паловы. Замацаваны ўсе коні на ўвесь час работ за поўнымі калгаснікамі, прагледжаны, прывядзены ў порадак і прымацаваны ўсе збруі, адрыхтаваны плугі, калёсы. Хоць сёньня ў поле. Але...

Ходзіць сумна пенто Серадаў. Пагляне на талы сьнег, на сонца. Нічэ адна думка... І гной ужо вывезьлі амаль на тры чэрці, і пасеньне ўсё падрыхтавана, і інвэнтар і збруя адрыхтаваны ў брыгадзе, і людзі на работы па сяўбе разьбіты, але...

Туляецца пенто па двары, насунуўшы шапку на вочы, брыгадзір.

Коняй перад сяўбой падкармліць трэба. Яд сьлед падкармліць. Моцнымі, канцентраванымі кармамі.

Засмучаны Серадаў. Мала ў калгасе такіх каркоў. Ня ўлічылі раней, прапусьцілі. А цяпер... Што рабіць?

...Брыгадная вытворчая нарада пачалася з маўчанкі. Серадаў абвясьціў, што трэба абгаварыць пытаньне аб узмацненні каркоў коням, сказаў, што прапусьцілі ён ня толькі, і сеў. Затрымалася ўся брыгада. Адны пачалі курыць, нехта пачаў выплюўся. Маўчалі нядоўга, нешчыма і каго першага нарадзілася думка — правесьці сярод калгаснікаў пазыку для ўмацаваньня коняй, сабраць бульбу, збожжа, іншыя кармы, хто што мае і хто колькі можа. Галасавалі дружна і адразу-ж пачалі падпіску. Хто даваў падпіску на 100, на 80 кілё бульбы, хто па пуду, на паўпуду збожжа. Сабралі ў брыгадзе дзьве тоны бульбы, 10 пуд. збожжа. Выдзілілі на гаспадарчыя ўсе іншыя брыгады.

...

УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ" (Сталін)

Усе сілы, усю энэргію, усю волю на ўдарнае правядзеньне сяўбы!

Е. ДУБЕНЬ

Калгасьніца-ўдарніца с.-г. арцелі „Ударнік"

ЯНЫ-Ж МАЕ, КАЛГАСНЫЯ

Даўно гэта было. Моладзь, вось, напрыклад, унук мой, ня ведае, што гэта за салодкае было жыцьцё ў пана, у батрака. А я вось слухала ў пана такога, Базілеўскага, і ў цяжкай працы правяла сваё дзяцінства. Адтуль і злоба мая нарадзілася на панаў.

І яшчэ з таго часу, як жука майго на вайну з японцамі забілі, — злоба мая яшчэ мацнейшая стала.

Помню, прыйшла я ў той дзень да пана, павалілася перад ім поперак пакою, крычу, кулакамі пагражаю.

— Ну, скажэце, што-ж гэта будзе, — гавару. — Вы-ж яго на вайну паслалі. Хіба-ж дзеткі вінаватыя за тую вайну.

Яны мяне выгналі. А я пабегла па белых пакоях з вялікімі вокнамі.

Нібы і зараз перада мной гэтыя вокны ў поўным вячэрняга сонца...

У гэту-ж ноч я разам з іншымі адзіначоўцамі падпаліла панскі маёнтак...

Пачалося маё ўдоўе пакутнае жыцьцё.

Вось чаму мая злоба ніколі не патухае.

Дзеці ёй патухнуць, калі і Мірона, майго старшага сына—бальшавіка-ваяра на фронце забілі, калі і малодшага Бузьму (14 год хлапчуку ўсяго было) белагвардзеі на маіх вачох расстралялі?

Дзеці ёй, злобе маёй, патухнуць?

Цяпер аб сваім калгасе.

Было нас некалькі бедакоў з вёскі Лікаўка. Баркоўскі, Каўчак ды я — удава. Усе бедныя, на вужай палосцы, без шчэ мучыліся. На маіх плячох — 2 унукі з нявесткай ад старшага сына Мірона.

Гэта было ў 1930 годзе. Парашылі арцельна жыць. Пайшлі ў раён, землямера запрасілі. Выйшлі ў поле. Вёска ў 150 двароў супроць нас 4-х выступіла. Пазыходзілі нашы слупы на полі, пайшлі на нас варожай сцяной. Уцяклі нашы ў лес. Там доўгі час хаваліся. А я ляском, праз хмызьняк дабралася да сакратара парт'ячэйкі, гавару:

— Сілу давай, Рымшын. Кулачво ўсю вёску ўзбунтавала.

Прыехалі з раёну, арыштавалі кулакоў. Прытаіліся, хоць і ня спалі, ворагі. Калі-ж ў 1931 годзе зноў мы арганізаваліся ў калгас, прыехала нам на дапамогу рабочая брыгада з Барысава. Тады справа лепш пайшла. Цяпер наш калгас умацаваўся — 20 кароў маем, 11 коняй. Гэта на 10 гаспадарак, янія ў калгасе. Пры тым кожны калгаснік мае ў нас карову. Увосень мы поўнасьцю здалі дзяржаве ўсю норму прадуктаў. Ссыпалі насенны і страхавы фонды. Калгаснік атрымаў хлеба і бульбы, колькі ў яго ранней ніколі ня бывала.

Я вось атрымала 70 пуд. збожжа., 30 пуд. ячменю, 200 пуд. бульбы, некалькі дзесяткаў пудоў іншых прадуктаў. Купіла новую хату. Цяперака пазіраю на сваю старую хацёнку, дзе свае пакутнае ўдоўе жыцьцё прамаялася, і ўспамінаю словы таварыша Сталіна. Так, таварыш Сталін, **МЫ ХУТКА БУДЗЕМ ЗАМОЖНЫМІ.**

Цяпер я сама член праўленьня калгасу. Сама на сваім вопыце ведаю, што сіла калгасу ў нас саміх. Будзем добра працаваць — калгас будзе моцны. Я сама даярка, цялят даглядаю. Баровы мае добрыя, цялята дагледжаныя. А чаму? **ЯНЫ-Ж МАЕ, КАЛГАСНЫЯ.**

А ёсьць яшчэ ў нас такія калгаснікі, як напрыклад, Каўчак — брыгадзір. Ён хаця і бядняк, але-ж кулаку лёгка такіх на свой бок перацягнуць. А чаму? Не ўсьвядомілі яны яшчэ, што такое калгас і арцельная наша праца на зямлі. Вось іх кулакі і скарыстоўваюць.

А ў нас іх даволі. Кальцом акружылі калгас... Якуб Мікітаў Сахончык, у якога я батрачыла. Ці-ж ён даруе нам, беднякам, за тое, што мы адрэзалі яго зямельку? Васіль Хаткевіч — кулак, Мікалай Сахончык. Той больш праз бабу дзейнічае супроць калгасу. А ці-ж мала оплях, асабліва серадняцкоў, знаходзіцца яшчэ пад іх упливам? Вось Абрамовіч Ігнат, з якім я разам на палосцы мучылася. У яго конь прыстае, хлеба няма, а ўсё нечага чакае.

— Як усе пойдуць, і я пайду.

— Ці-ж ты ня помнітаеш, як мы з табой рабілі і як зараз мы жывем? От-жа і хата ў мяне новая. І хлеба на рынку прадала і бульбы багата і сама сытая.

Нешта скрабе патыліцу Ігнат. А чаму скрабе?

Шэпча на вуха, што нібы вайна хутка будзе з Польшчай, ці з Кітаем. Гэта ўжо са слоў, з апчтацьі Сахончыка Якуба.

— Эх, Ігнат!

Выгнаць кулака з калгасу, да канца выгрушыць кулацкае ахвосьце — вось што патрэбна цяпер для нашай калгаснай справы. І мы гэта зробім. Я сама не адступлю. Нічога, што мне шосты дзесятак пашоў.

НІКОМУ НЯ ЎСТУПІМ

Старшыня калгасу «Расьсьвет пераможца» **ПУГАЧОЎ ПІЛІП** толькі што вярнуўся з раённага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў. Ён адсутнічаў два дні, але колькі сур'ёзных спраў пакапілася ў калгасе. Да позьняй ночы ў дзень прыезду ён сядзіць у праўленьні, правярае, што зроблена, што ня зроблена, дае заданьні.

Пачынае псавацца дарога, трэба хутчэй вывезьці на поле гной.

Коняй трэба паставіць да сяўбы тыдні на два падкармліцца, адпачыць. Сотні спраў.

У кузьні, у сталярнай, у сыраварні, па стайнях, у сьвірне, на будоўлях, усюды патрэбна гаспадарскае вока.

І ў тав. Пугачова ёсьць гэта гаспадарскае вока. Вока ня дрэннае, вока трапнае.

Тав. Пугачоў заглядае новыя дуці, па іх напісаны нумар і назва каня.

— Гэта ня так, трэба бляшаныя нумары. Так напрыгожа і патрацца хутка.

У сьвінарніку першай брыгады ня ўбран калідор, замерзла вада, ў стоках лёд. Грэз. Тав. Пугачоў кліча брыгадзіра і патрабуе неадкладнай ачысткі сьвінарніка.

Брыгадзір прабуе апраўдацца і тое, і другое, і трэцяе. Пугачоў ня слухае. Каб было ўбрана!

Праз час у сьвінарніку чыстата.

— Працаецца кровельнае жалеза, трэба купіць, пакрыць будынкі. Бубніць у вушы Пугачову стары калгаснік.

— Трэба знайсьці тры тысячы, трэба забраць жалеза.

Пугачоў трэ галаву. Няма грошай, дзе іх узяць?

Сродкаў сапраўды няма. Пугачоў растлумачвае гэта старому вельмі падрабязна. Стары паступова супакойваецца.

У праўленьне ўбягае жанчына. Патрабуе дроў, цэлы, пагражае, што пойдзе з калгасу.

Пугачоў цярпліва, спакойна выслухоўвае яе папрокі, растлумачвае, што яна атрымала дроў столькі, колькі ёй неабходна, калі яна іх неахайна расходвала, дык сама вінавата.

Пугачова клічуць да тэлефону. Ён на ходу тлумачыць:

— Кулацкія прыхваснькі, гэта кулацкая работа, хочуць разбурыць калгас.

Пугачоў член калгасу з самага яго заражэньня. Ён адзін з актыўных барацьбітоў за моц калгасу.

Будучы яшчэ ў Чырвонай армії і прыехаўшы ў сваю вёску на адпачынак, ён прымаў удзел у арганізацыі калгасу.

Пугачоў рос разам з калгасам. Перамогі калгасу — перамогі Пугачова, паражэньне калгасу — паражэньне Пугачова. — Але ніколі, — заўляе Пугачоў, — нават у самыя цяжкія мінуты пасьля пажару [illegible] коняй спалілі кужкі, ніко[illegible] мы ня пакалі духам. Ні перад як[illegible] труднасьцямі не адступалі і не адступім надалей.

Тав. ПУГАЧОЎ

«Цихая сапа» кулак[illegible], як[illegible] стараюцца падарваць з сярэдзіны, тонка ад чуваецца Пугачовым. Ён на варце заўсёды. Кожны выпадак, кожны калгаснік і яго праступкі прадумываюцца, разьбіраюцца Пугачовым.

Адзін час сталі больш частымі пакражы, цягнуць пачалі дошкі, лесаматар'ялы. Выявілі ворагаў, так тузанулі, што і другім стала непазадна.

Гледзячы на Пугачова ясна ўсплывае тое, што няма дрэнных калгасаў, а ёсьць дрэнныя кіраўнікі.

Гісторыя падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, гэта гісторыя барацьбы калгасу, клясавай барацьбы.

Тав. Пугачоў цьвёрда і ўпэўнена, разам з парт'ячэйкай, вядзе калгас на бальшавіцкім шляху.

Цяжка калгасу прыходзіцца з кваліфікаванымі работнікамі, няма апранома, няма зямляўпарадкавальніка, няма вэтэрынара. Усё робіцца сваімі сіламі. Каля 150 калгаснікаў прайшлі розныя курсы, напрыклад, жывёлагадоўлі, рахункаводзтва і г. д.

Да сяўбы калгас амаль гатоў. Канчаюцца апошнія работы, падрыхтаваньні. Дакладна прадумваецца Пугачовым расстаноўка рабочай і цягавай сілы. Яшчэ больш дакладна абгаворваецца плян сяўбы з калгаснікамі.

Тав. Пугачоў упэўнена глядзіць наперад:

— Наш калгас быў першым і застанецца першым. Нікому ня ўступім!

— Наш калгас будзе бальшавіцкім!

Жлобін. Ш.

ЗА САВЕЦКІМ РУБЯЖОМ

Капіталізм асуджае працоўныя масы сялянства на руйнаваньне, голад і галечу

Як жыве працоўны селянін у фашысцкай Польшчы

Сёньня адкрываецца ўсебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў — лепшых людзей новай калгаснай вёскі. Яны зьбіраюцца ў гістарычную вясну другой пяцігодкі. Каля тысячы калгаснікаў-ударнікаў з усіх куткоў БССР прыехалі на зьезд, каб абгаварыць, як лепш падрыхтавацца і правесьці веснавую сяўбу, як лепш арганізаваць працу ў калгасе, павысіць ураджайнасьць, паладзіць дагляд калгаснай жывёлы, асабліва калгаснага каня.

Наша ленінская партыя, пад кіраўніцтвам тав. Сталіна, вывела працоўнае сялянства на адзіна правільны шлях — шлях калгасаў. Кулацтва, што, як гаварыў Уладзімер Ільліч Ленін, высмоктвала кроў з працоўнага селяніна, разгромлена. На вёсцы перамаглі карэньні капіталізму і перамога сацыялізму забясьпечана.

Клясавы вораг, аднак, яшчэ не дабіт і аказвае шалёнае супраціўленьне. Галоўнае цяпер у тым, каб «умацаваць калгасы арганізацыйна, выпыбіць адтуль шкодніцкія элементы, падабраць сапраўдныя праверэныя кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі» (І. Сталін).

Наша партыя дамагаецца таго, што цяпер у калгасах былыя беднякі жывуць ня горш за сераднякоў. Нам прадстаіць зрабіць яшчэ адзін крок наперад — дамагчыся таго, каб усе калгаснікі сталі **ЗАМОЖНЫМІ.**

Такавы факты. Такава наша сёньняшняя сапраўднасьць.

А што «ў іх»—за рубяжом, у фашысцкай Польшчы?

Дамо таксама слова фактам.

МІЛЬЁНЫ СЯЛЯН ГАЛАДАЮЦЬ

Фашысцкая палітыка, накіраваная на ўзбуйненьне кулацкіх і памешчыцкіх гаспадарак, насаджваньне асаднінцтва на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, барбарская эксплёатацыя працоўнага сялянства памешчыкам, кулаком, а на Зах. Беларусі таксама і беларускай буржуазіяй, асаднікам і ліхвяром, празьмерныя падаткі давялі сялянства да голаду. Распачынае становішча сялянскіх масаў яшчэ больш абвастраецца крызісам.

«Катастрофа зямляробства», «Вёска — гэта могілкі», «Безнадзейнасьць і нэндза» — вось загалоўкі, якія амаль штодзенна зьяўляюцца на старонках польскага друку.

Зразумела, фашысцкі друк б'е трывогу аб катастрафічным становішчы вёскі не таму, што ён так клапоціцца пра дабрабыт працоўнага селяніна. Гэта робіцца ім у мэтах ратаваньня ўласнай скуры перад надыходзячай пралетарскай рэвалюцыяй.

Выступаючы на пасяджэньні сэйму 26-27 лютага г. г. эндэцкія сэнатары Гадлеўскі і Цястак даюць такі малюнак сучаснай польскай вёскі. Сэнатар Гадлеўскі, напрыклад, заявіў, што «запазычанасьць польскага зямляробства дзяржаве на 1 кастрычніка 1932 г. складала 4,5 млрд. злотых, г. зн. 150 злотых на кожнага жыхара Польшчы. Адпачасова процэнты па даўгох складалі паўмільярда злотых. У рэзультаце досьледаў дробных гаспадарак, праведзеных міністрам Станевічам, устаноўлена, што прадукцыя іх на працягу апошніх 6 год страшэнна ўпала і зараз дае мінус.

Сучаснае становішча польскага зямляробства — **КАТАСТРАФІЧНАЕ.**

Сэнатар-жа Цястак паведаў сучасную польскую вёску «могілкамі, па якіх блукае падатковы экзэкутар. Сёньня селянін варочаецца да гэбні і кросіва, ня мае гроша на газу, цэлы год посьціць, жыве на хлебе і вадзе, абыходзіцца без солі. Дзеці яго абарваныя і босыя. Высылаюцца супроць яго (селяніна) узброеныя карныя экспэдыцыі для сьцягвання падаткаў».

Фашызм, якому патрэбны вялізарныя сродкі на ўзбраеньні, усё больш і больш запіскае падатковую шрубу. Палітыка авантур і ліхаманкавага ўзбраеньня прывяла да таго, што нават паводле афіцыяльных даных у Польшчы каля **2.000.000 сялянскіх гаспадарак ГАЛАДАЕ.**

Пэнэсэўскі «Роботнік» з пасьпехам вясны з трывогай пішна аб гэтых мільёнах галадаючых сялянскіх гаспадарак:

«Пасьля збору ўраджаю значная частка гэтых нішчасных устрымалася ад пасеву азімых, мяркуючы, што троба як-небудзь пражыць бліжэйшую зіму, а весной можа будзе тая ці іншая праца ды насеньне можна будзе купіць.

Гэтыя надзеі не апраўдаліся. Вялізарная частка ўласьнікаў гэтых карлікавых гаспадарак, якія зелі ўсё насеньне збожжа і бульбы, зараз сталі перад грозным пытаньнем — чым засеяць палі?».

Калі такое становішча польскай вёскі, паводле афіцыяльных, паглядкоўных даных, дык аб захопна-беларускай вёсцы ня прыходзіцца і гаварыць. Тут апушчальная палітыка фашызму носіць яшчэ больш адкрыты грабежніцкі характар. Эксплёатацыя працоўных мас яшчэ больш жарсткая. Яна ўзмацняецца яшчэ ўцёскам з боку ўласнай беларускай буржуазіі і кулацтва, асаднікаў і ліхвяроў. Гэта барбарская эксплёатацыя дапаўняецца яшчэ страшэнным нацыянальным уціскам.

ЗАМЕСТ ХЛЕБА—ПАДАТКОВЫЯ ЭКЗЭКУЦЫІ, СУДЫ, ШЫБЕНІЦЫ

Нават урадавай фашысцкай газеце — «Кур'еру віленскаму» прыходзіцца характарызаваць цяперашняе становішча вёскі адным словам «нэндза».

Пераважная большасьць працоўных Заходняй Беларусі галадае. Гэтага ня скрываюць нават і фашысцкая прэса. З усіх раёнаў ЗБ высуцца крыкі аб голадзе, аб пашырэньні на глебе голаду эпідэміі, розных заразьлівых хвароб.

«На Палесьсі голад проста зазірае людзям у вочы. У гэтым годзе голад дае сабе адчуць у цэлым радзе паветаў і выклікаў эпідэмію тыфусу». (Дзеньнік віленскі» ад 21-XII—32 г.).

Селяніны з Навагрудзкага ваяводзтва ў сваім лісьце пішуць:

«Ураджай у Навагрудчыне ў гэтым годзе вельмі дрэнны. Шмат сялян прымушаны былі купляць хлеб. Цэлыя воласьці галадаюць. Карэлицкая воласьць, дзе зямлы лічыцца параўнаўча самай лепшай у акрузе, дык і тут неўраджай і сяляне мяняюць пуд збожжа з 3 пудамі мякіны і так мелюць. Зараз гэта масавае зьявішча, як за Пёманам, у Шчарсоўскай, Негвічоўскай валасьцёх».

Факты з іншых лістоў:

«У вёсках Віленшчыны адчуваецца моцны голад. Ураджай у некаторых вёсках вельмі дрэнны. Сяляне сабралі ў такіх мясцовасьцях па 2-3 пуды збожжа. Ужо зараз асноўная маса ня мае хлеба».

«У вёсках Пінчшчыны неўраджай. Становішча сялян вельмі цяжкае. Сяляне зараз харчуюцца просам і бульбай, хлеба няма. Няма за што нават купіць запалак, солі, газы. Адна запалка расчапляецца на 2-3 часткі».

Орган камсамолу Заходняй Беларусі «Малады камуніст» за лоты дае жахлівы малюнак голаду на Заходняй Беларусі:

«Жудасны голад пануе на вёсках ЗБ. Хлеб знойдзеш цяпер толькі ў кулацкіх хатах, а ў нас бульбы ўжо не хапае. Працоўныя сяляне, моладзь і дзеці пухнуць з голаду, цэлымі сем'ямі кідаюць хату і зямлю і ідуць шукаць сабе ежу. Нават буржуазныя газэты прызнаюць, што такога голаду даўно ня бачыла вёска. На глебе голаду масава, па ўсёй ЗБ, пашыраюцца эпідэміі тыфусу і інш. хваробаў. Напрыклад, у вёсцы Южаны (Віленска-Трокскі павет) выбухнуў плямісты тыфус. Эпідэмія прынятае такія размеры, што, каб не выпускаць і ся ўпускаць нікога з гэтай мясцовасьці, увесь раён акружан пасцэйскім кардонам».

На глебе голаду ўзрастаюцца часта самагубствы як у горадзе, так і па вёсцы. А фашысцкі ўрад спрыяе ліквідуе нават тую жабрацкую дапамогу беспрацоўным, якая існавала яшчэ і да гэтага часу, і стварае для беспрацоўных «батальёны працы». Адпачасова ўсё больш растуць падаткі. Зараз амаль няма такой рэчы ў сялянскай гаспадарцы, якая-б ня была ападаткавана. У мэтах узмацнення ня падатковага прэсу, з 1 студзеня г. г. увядзена ў жыцьцё новае экзэкуцыйнае права, на падставе якога сэквэстратар, паліцэйскі, камэрнік нагогул прадстаўнік улады мае права ў любую хвіліну дня і ночы зрабіць вобыск на толькі ў гаспадарцы селяніна, але асобіста ў яго і члена яго сем'і і забраць апошнюю капейку. Для ўзмацнення акупацыйнага апарату, для ўзмацнення апарату тэрору, для павялічэньня ўзбраеньня выцісканцца з працоўных апошнія соки.

РАСЬЦЕ МАГУТНЫ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ЎЗДЫМ

Галадаючыя масы арганізуюць пад кіраўніцтвам КПП, КПЗБ і КПЗУ акцыі. Захоп фабрык баставучымі, штурм беспрацоўнымі магістратаў, крывавыя сутычкі з паліцыяй, як гэта мела месца пару дзён таму назад у Пабяніцах, — амаль штодзенныя зьявішчы ў сучаснай фашысцкай Польшчы.

Адпачасова абвяшчаецца жорсткая барацьба сялянства супроць камасацыі, барацьба супроць падаткаў, шар варак. Лёзунг кампартыі «ні граша падаткаў акупантам» знаходзіць усё большае пашырэньне сярод працоўных мас ЗБ. Гэты адпор мас, рост рэвалюцыйных настрояў акупацыйная ўлада імкнецца задушыць шляхам карных экспэдыцый, вешання-палявых судоў, шыбеніцамі.

Паводле вестак пэпэсэўскага «Роботніка», на працягу толькі 14 месяцаў у Польшчы было вынесена 200 прыгаворэў кары сьмерцю, прычым пераважная большасьць з іх прыпадае на ЗБ і. ЗУ.

У вёсцы Баранава прыбыла карная экспэдыцыя, арыштавала 18 чалавек, іх завезьлі на пастарунак і там страшэнна сталі. Гэта выклікала вялізарнае абурэньне сярод насельніцтва ўсяго раёну. На другі-я дзень, па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам КПЗБ, у 5 пунктах раёну адбыліся масоўкі-пратесты. Масоўкі адбыліся таксама ва многіх мясцох Алексынцкага і Горніцкага раёну. У Баранаве пасьля масоўкі адбылася буйная дэманстрацыя з чырвонымі сьцягамі і сьпяваньнем «Інтэрнацыяналу».

На другі-ж дзень—5 сьнежня зьявілася карная экспэдыцыя з 50 паліцэйскіх і некалькіх дзесяткаў шпікоў. Карная экспэдыцыя прайшла праз 12 вёсак. Усюды катавалі да страты прытомнасьці каго толькі хацелі.

Гэта выклікала яшчэ больш рашучы масавы адпор насельніцтва. У адзнаку пратэсту адбылася шматлюдная масоўкі і 2 дэманстрацыі. Паліцыя прыбыла з гранатамі і кулямётамі. Было арыштавана 50 чал. Пасьля катаваньня 30 былі выпушчаны, а 20 перавезены ў Горадзенскую турму.

Кампанія супроць «пацыфікацыі», пад кіраўніцтвам КПЗБ, разгортваецца па ўсёй акрузе.

Ня гледзячы на карныя экспэдыцыі, на шалёны тэрор, на ваенна-палявыя суды, магутнее рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух. Усё больш пашыраецца ўплыў кампартыі на вёсны, растуць сярод шырокіх мас і сымпатыі да СССР. Не дапамагае фашызму і кампанія хл[illegible]сьні і паклёпаў, якая вядзецца прадажнымі пісакамі і сацыял і пасобнікамі-фашыстамі.

Ня гледзячы на паклёпніцкую кампанію пра калектывізацыю ў СССР, растуць сымпатыі сярод захопна-беларускіх сялян да калгасаў краіны Саветаў. Гэтага ня можа ўтаіць нават і фашысцкая прэса. Сяляне в. Акуліна (Слонімшчына) чуючы, што ў Савецкім саюзе сяляне, перайшоўшы на шлях калгасаў, дамагаюся лепшага жыцьця, забраліся на гэст, выбралі 3 делегатаў да старосты ў Слоніме, каб заявіць, што яны пераходзяць на калектывізацыю.

Старэйшы, слухаўшы погады делегатаў аб кірысьні калектывізацыі спачатку аслупеў і ня ведаў што адказаць. Толькі праз некалькі хвілін прыйшоўшы ў сябе, ён, як укушаны, падскочыў з крыкам: **«Зы хочаце ў мане камуну заводзіць! Я вам пакажу камуну ў астрозе».**

У Навагрудчыне сяляне гавораць: «Цяпер'а мяю 2 дзесяцины, пасьля рэвалюцыі буду мець 4 або больш дзесяцін. Я цяпер усё здароўе ўлажыў у зямлю, і працаваць не магу. Зямли сябе не адыдяе, што я буду рабіць з гэтай зямлёй? Выхад адзін — калектывізацыя». Такія настрої сярод сялян пануюць у Турцы, Ровінах, Рутковічах, Кельчыцах і інш. мясцох Навагрудчыны.

У Церасполі (Палесьсе) сяляне пастановілі адабраць 200 дзесяцін у кулакоў і пабудаваць калгас. На сходзе выбралі нават праўленьне калгасу.

Такіх прыкладаў сымпатыі працоўных мас Заходняй Беларусі да калектывізацыі можна падаць дзесяткі і сотні.

Ня гледзячы на шалёны тэрор, на антысавецкую кампанію, на ўсе «жахі», якія пашыраюцца пра СССР, у тым ліку і пра БССР продажнымі фашыстамі і сацыял-фашыстамі пісакамі, а таксама і клерыкаламі, — працоўныя масы Польшчы і Заходняй Беларусі і Зах. Украіны ўсё больш усьведамляюць, што да вызваленьня з-пад улады акупантаў, каб рэвалюцыйна пакончыць з голадам і голадам, панаваньнем шляхты, шляхі расійскага пралетарыяту, шлях Кастрычніка.

А. К.

ГЕНЭРАЛ І БАБЫЛЬ

Весела сьмяецца Рыгор Бобрыкаў, ударнік калгасу «Расьсьвет пераможца». І чаго-ж сумаваць, калі забясьпечана сям'я Рыгорава ўсімі харчамі аж да новага ўраджаю, калі ўсе Бобрыкавы апрануты, калі штодня расьце і мацнее яго калгас, калі жудаснае мінулае зашчула назаўсёды.

Можна і пасьмяяцца.

А было...

***

Генэрал прачнуўся позна. Праменьні сонца праразалі шкло вакна, зганяючы ўсоры апошняга марозу. Налы ходзіла вясна і троба было ехаць у горад, далей ад гаспадарскіх клопатаў слуўбы. Хутка апрануўся генэрал Шышілаў, пасьнедаў, выйшаў на двор свайго маёнтку. Зараз павішы былі падаць коней і ўпрагаць чамаданы. Вялікі пост генэрал любіў праводзіць у горадзе, у сям'і, а ў маёнтку толькі канец зімы і восень.

Разражаючы талы сьнег, да ганку пад'ехаў сані. Генэрал апрануў паверх шынелі шубу і садзячыся ў сані пераражнаўся.

Тады да саняк падыйшоў бабыль—Рыгор Бобрыкаў.

Генэрал хацеў крыкнуць «трогай», але з дому яшчэ выносілі кадушку з маслам. Паглядзеў генэрал на разьбітыя Рыгоравы лапці, на худы, зморшчаны твар бабыля.

— Чаго табе?

Скажочыў Рыгор абшарапаную дзядоўскую шапку, выцісьнуў глытаючы сьліну:

— Да лебяды як пратрымацца...

Генэрал пакінуў рамні чамадану. Падумаў: у брудзе, хваробах, голадзе вымірае сялянская Расія. Выдаў сябе генэрал за лібералам і заўважыў:

— Працаваць трэба. Зямлю сваю маеш?



РЫГОР БОБРЫКАЎ

Ступіў Рыгор бліжэй, трапіў у лужу.

— Да лета як пратрымацца? Працу якую дайце, Ваша...

Кадушка была пастаўлена ў сані, рамні чамадану нацягнуты добра. Генэрал махнуў рукой. Коні рвануліся.

Каля парквы генэрал паглядзеў назад. На горцы раскінуўся генэралавы маёнтак — Шышілава. Ля ганку яшчэ стаяў бяз шапкі Рыгор Бобрыкаў, быццам чагосьці чакаючы.

Коні беглі добра. Генэрал успомніў: віленскі генэрал-губернатар Хаванскі даказваў, што сялянне галадаюць па сваёй ахвоце, каб менш працавалі. Хаванскі прачытаў імператара выпадзь указ з жабрэнай, над страхам цяжкай кары, ужываць замест хлеба мякіну, лебяду і крапіву. Генэрал ухмыльнуўся.

— А ну, шпар хутчэй!

***

Павольна праходзіў Рыгор Бобрыкаў па калгасныя двары. Тут, у былым маёнтку генэрала Шышілава быў цяпер гаспадаром Рыгор. Зашоў па дарозе Рыгор у стайню, паглядзеў колькі гною вывезьлі за дзень. Заўважыў: мала. Пайшоў далей, зазіраючы па дарозе ў гаспадарчыя пабудовы, прыглядаючыся да недахопаў, адкладваючы ў галаве заўвагі брыгадзіру, загадчыку скотнага двара, старшыні калгасу

У новым Рыгоравым доме жонка шыла нешта на швэйнай машыне, а ў кутку сядзеў Рыгораў брат — Хвёдар, адназобнік. Зьняў Рыгор на кухні прамоклы кажух і цяжкія боты, ступіў у пакой.

— Ну, як, Хвёдар усё пакутуеш?

Хвёдар пастукаў загрубелым пальцам па машыне.

— Ня цуры, Рыгор. Я па справе.

Сеў на стул Рыгор, паціў руку.

— Вось паглядзі: хата новая — калгас дапамог будаваць. Голькі цяпер, у калгасе, боты сабе і жонцы купіў. Чаму ты да гэтага часу на сваёй палосцы?

Уздыхнуў Хвёдар. Паглядзеў па новую швэйную машыну, на новую вапратку Рыгора, на добра апрануты вэшаей.

— Ты многа працаваў Рыгор. У калгасе цяжкая праца...

Пакруціў галавой Рыгор:

Чые словы гаворыш? Ты-ж кожны наш крок ведаеш. Не цяжэй за тваю. Працаваў, верні, нямала. Зэтое-ж заблемечая. Випрацаваў за год 402 працадні, а з сям'ёй 780.

І ў каторы раз пітаў пералічаць Рыгор свой заработак: збожжазых культур — 75 пудоў, бульбы — 350 пудоў, ды яшчэ свой агарод, ды яблыкі, ды гародына, ды...

Уважліва слухаў Хвёдар, апусьціўшы вочы.

— Ды яшчэ 800 рублёў грашыма. Во! Ну як, добра ў калгасе, Хвёдар?

— Добра... Заробілі багата...

— А чаму ты ня ўступаеш?

Нічога не адказаў Хвёдар. Успомнілася яму, як быў Рыгор бабылём, улетку кароў пасьвіў, на заработкі хадзіў, нічога свайго ня меў, а ён, Хвёдар, тады ў серадняку выбіваўся. Праводзіў параўнаньне лапіж сваёй гаспадаркай цяпер і Рыгоравай. Вынік быў па карысьць Рыгора.

Але яшчэ ўчора крычала жонка, што ў калгас ня пойдзе — ня раюць добрыя людзі. Крыху шкада было і Хвёдару аддавать у агульны хлеў свайго коніка-небараку, аблітую потам збрую, голадам скалочаныя калёсы. Вырашыў Хвёдар — пачакаць.

- Ты па якой справе прышоў?

- Ды не, я так...

- Вырашыў як з калгасам, Хвёдар?

— Дай крыху мазгі пакруціць...

Устаў Рыгор, зьняў піджак, павесіў у шафу.

— Эх ты, хісткая натура.

Падняўся Хвёдар.

— Ну, пайду я...

Узяў Хвёдар шапку, разьвітаўся, выйшаў. Каля вокан чакнулі на вадзе яго лапці.

Запаліў Рыгор газэтку, сеў вячэраць. За дзень змарыўся, а заўтра — добры кавалак работы, не адступаць ў вывазцы ўгнаеньня.

Паступала цёплая веснавая ноч. На былых прасторах генэрала Шышілава, у новых дамох, калгаснікі рыхтаваліся адпачыць.

***

Сьмяецца Рыгор. А чаму-ж і не сьмяецца, калі працэнтаж мінулае заўпуна раз і назаўсёды, калі для Рыгора пачалося новае, сьветлае жыцьцё.

...Весела сьмяецца Рыгор.

ШАМШУР, ІВАНОЎ.

Калгас «Расьсьвет пераможца», Жлобінскі раён.

ПРА АБАВЯЗКОВУЮ ПАСТАУКУ БУЛЬБЫ ДЗЯРЖАВЕ КАЛГАСАМІ І АДНААСОБНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) за 20 лютага 1933 г. «Пра абавязковую пастаўку бульбы дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» («Известия ЦИК СССР и ВЦИК» № 51 за 21 лютага 1933 г.), Савет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б **пастанаўляюць:**

1. Парадак здачы (продажу), устаноўлены пастановамі СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 19 студзеня 1933 г. і СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 24 лютага 1933 г. у адносінах збожжавых культур, пазбыць на бульбу і ўстанавіць для калгасаў і аднаасобных гаспадарак узамен існуючай дагаворнай (кантрактацыйнай) сыстэмы загатовак бульбы цьвёрдыя, малочныя сілу падатку, абавязацельствы па здачы бульбы дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах.

2. Устанавіць наступныя, зацьверджаныя пастановай СНК СССР за 13 сакавіка 1933 г. № 460, параёныя нормы здачы бульбы дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі з ураджаю 1933 г. па калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, калгасах, якія не абслугоўваюцца МТС, калгасьніках па несаграмаджаных пасевах і аднаасобных гаспадарках з разьліку на кожны гэктар устаноўленага на вясну 1933 году пляну пасеву бульбы (у цэнтнэрах):

РАЁНЫ		Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС	Калгасы, якія неабслуг. МТС	Калгасьнікі па несаграмадж. пасевах бульбы	Аднаасобныя
1. Бабруйскі	—	11,5	14,5	16,0	17,5
2. Брагінскі	—	—	18,0	21,0	24,0
3. Чыжэўска-Слабодзкі	—	11,5	—	16,0	17,5
4. Рагачоўскі	—	11,5	14,5	16,0	17,5
5. Талачынскі	—	11,5	14,5	16,0	17,5
6. Уваравіцкі	—	—	18,0	21,0	24,0
7. Хойніцкі	—	11,5	14,5	16,0	17,5
8. Менскі	—	11,5	14,5	16,0	17,5
9. Магілеўскі	—	11,5	14,5	16,0	17,5
10. Асіпавіцкі	—	—	12,5	13,5	15,5
11. Кармянскі	—	—	12,5	13,5	15,5
12. Буда-Кашалеўскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
13. Быхаўскі	—	—	12,5	13,5	15,5
14. Бялыніцкі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
15. Бярэзінскі	—	—	12,5	13,5	15,5
16. Веткаўскі	—	—	12,5	13,5	15,5
17. Віцебскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
18. Гомельскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
19. Дзяржынскі	—	9,5	—	13,5	15,5
20. Жлобінскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
21. Заслаўскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
22. Капыльскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
23. Смаляніцкі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
24. Лагойскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
25. Аршанскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
26. Пухавіцкі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
27. Чэрвеньскі	—	—	12,5	13,5	15,5
28. Рэчыцкі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
29. Стара-Дарожскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
30. Церахаўскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
31. Вузьдзенскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
32. Чачэрскі	—	—	12,5	13,5	15,5
33. Крычаўскі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
34. Слуцкі	—	9,5	12,5	13,5	15,5
35. Барысаўскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
36. Горацкі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
37. Глускі	—	—	12,0	13,0	15,0
38. Дубровенскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
39. Камарынскі	—	—	12,0	13,0	15,0
40. Клічаўскі	—	—	12,0	13,0	15,0
41. Крупскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
42. Чырвонапольскі	—	—	12,0	13,0	15,0
43. Лоеўскі	—	—	12,0	13,0	15,0
44. Любаньскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
45. Мсьціслаўскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
46. Парыцкі	—	—	12,0	13,0	15,0
47. Пятрыкоўскі	—	—	12,0	13,0	15,0
48. Плешчаніцкі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
49. Прапойскі	—	—	12,0	13,0	15,0
50. Сеньненскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
51. Старобінскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
52. Чавускі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
53. Чашніцкі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
54. Чэрыкаўскі	—	—	12,0	13,0	15,0
55. Шклоўскі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
56. Касьцюковіцкі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
57. Клімавіцкі	—	9,0	12,0	13,0	15,0
58. Гарадоцкі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
59. Дрысенскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
60. Лепельскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
61. Лёзьненскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
62. Полацкі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
63. Расонскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
64. Сіроцінскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
65. Сураскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
66. Асьвейскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
67. Мазырскі	—	8,0	10,5	12,0	13,5
68. Бешанковіцкі	—	4,0	7,0	8,5	10,0
69. Бягомльскі	—	4,0	7,0	8,5	10,0
70. Жыткавіцкі	—	4,0	—	8,5	10,0
71. Ельскі	—	—	7,0	8,5	10,0
72. Лельчыцкі	—	4,0	7,0	8,5	10,0
73. Тураўскі	—	4,0	7,0	8,5	10,0
74. Вушацкі	—	4,0	7,0	8,5	10,0
75. Нараўлянскі	—	—	7,0	8,5	10,0

Устаноўленыя вышэй параёныя нормы зьяўляюцца абавязковымі для кожнага раёну і ня могуць падлягаць зьменам.

3. Устанавіць наступныя каляндарныя тэрміны выкананьня калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі . гадавых абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве ў процатах ад пагэктарных норм, устаноўленых п. 2 гэтай пастановы:

У жніўні месяцы — 2 проц.
У верасьні месяцы — 20 проц.
У кастрычніку месяцы — 65 проц.
З 1 па 15 лістапада — 13 проц.

4. Захаваць існуючыя цэны на бульбу, якая здаецца дзяржаве.

5. У залік выкананьня калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі сваіх абавязацельстваў, устаноўленых гэтай пастановай, прымаецца толькі бульба добраякасная (сухая, ачышчаная ад зямлі, здаровая); бульба мокрая, хворая, механічна пашкоджаная, марожаная не залічваецца ў выкананьне абавязацельстваў калгасаў і аднаасобных гаспадарак.

6. Калгасы, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве ва ўстаноўленыя гэтай пастановай каляндарныя тэрміны, прыцягваюцца праз сельсаветы да штрафу трапына ў разьмеры рыначнага кошту недавыкананай часткі абавязацельства і звыш гэтага да гэтых калгасаў прад'яўляюцца патрабаваньні аб датэрміновым выкананьні ўсяго гадавога абавязацельства, падлягаючага спагнаньню ў бясспрэчным парадку.

Аднаасобныя гаспадаркі, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве да ўстаноўленага гэтай пастановай тэрміну, прыцягваюцца да судовай адказнасьці паводле артыкулу 94 Крымінальнага кодэксу БССР.

7. Выкананьне ўстаноўленых гэтай пастановай абавязацельстваў па здачы бульбы дзяржаве зьяўляецца першачарговым абавязкам кожнага калгасу і аднаасобнай гаспадаркі і павінна быць праведзена з першых зборaў. Устанавіць, што калгасны гандаль бульбай будзе дазвалянца толькі пасьля выкананьня ўстаноўленага на аснове гэтай пастановы пляну пастаўкі бульбы ў цэлым па рэспубліцы і поўнай сэсыкі, пасьля выкананьня пляну пастаўкі бульбы, насенных фондаў.

8. Бязумоўна забараняецца мясцовым органам улады і загатоўчым органам дапускаць сустрэчныя пляны або накладаць на калгасы і аднаасобныя гаспадаркі абавязацельствы па здачы бульбы, перавышаючыя пагэктарныя нормы, устаноўленыя гэтым законам. Усе лішкі бульбы, пасьля выкананьня абавязацельстваў па здачы дзяржаве бульбы, застаюцца ў поўным распараджэньні самих калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.
20 сакавіка 1933 г.
г. Менск.

ТАМ, ДЗЕ ШАГАЕ БЕЛЫ ТЭРОР

„БЯЗЬЛІТАСНА УЖЫВАЦЬ ЗБРОЮ"

ЗАГАД БАДЭНСКАГА ПАЛІЦЭЙСКАГА КІРАЎНІЦТВА

БЭРЛІН, 19. За апошнія дні ў адным толькі раёне **Бэрліну—Нэйкельну** арыштаваны 34 камуністы. У **Бадэне, Карлёруэ** арыштавана каля 100 актывістаў кампартыі і сацыял-дэмакратычнай партыі. Забаронены рабочыя спартыўныя арганізацыі стралкоў, усе паўваенныя і юнацкія рабочыя арганізацыі. Па ўсім горадзе шмат вобыскаў. **У Бадэне паліцэйскае кіраўніцтва акругі прапануе паліцэйскім бязьлітасна ўжываць зброю.** Па таго, хто выходзячы з няправільна ўсьвядомленай гумавласьці будзе аказваць літасьць, — гаворыцца ў загадзе, — будзе накладзена дысцыплінарнае пакараньне.

У Дасау забаронены ўсе арганізацыі сацыял-дэмакратычнага «жалезнага фронту» і рэйхсбанэру. Па паведамленьні паліцыі, у горадзе праводзіцца шмат вобыскаў, у часе якіх быццам знойдзена ня толькі зброя, але і «важныя друкаваныя выданьні». Два члены мясцовага самакіраўніцтва і адзін служачы арыштаваны. **У Брауншвэйгу** арыштован член мясцовага ляндтагу і былы міністар фінансаў с.-д. **Яспэр. У Вэйсвасэры** атрадам дапаможнай паліцыі пры дапамозе рэгулярнай паліцыі занят народны дом. Канфіскован рад друкаваных выданьняў. У часе вобыску арыштаваны 22 сацыял-дэмакраты. У **Цюрынгіі** звальняюць усіх сацыял-дэмакратычных чыноўнікаў. Па паведамленьні «Ангрыф», у **прамысьці Бэрліну** нібыта раскрыта падпольная камуністычная друкарня, у якой канфіскавана 15 цэнтнэраў літаратуры і арыштавана 24 чалавек. У акрузе **Ліпцэ** забаронены ўсе арганізацыі рэйхсбанэру і «жалезнага фронту». Па паведамленьнях «Вольфа», у **Глейвіцэ** сьмяротна параней невядомым адзін нацыянал-сацыяліст — член дапаможнай паліцыі.

У **Браўншвэйгу** арыштован пон Кек, які абвінавачваецца ў тым, што ў часе царкоўнай пропаведі праяўляў нацыфісцкія тэндэнцыі.

Нацыянал-сацыялісты зрабілі налёт на вілу пісьменьніка Фэйхтвангера ў **Грунэвальдзе** (Бэрлін). Фэйхтвангер знаходзіцца ў цяперашні час за граніцай. Налётчыкі зьнішчылі рад дакумантаў і ўзялі з сабой рукапісы новага твору Фэйхтвангера. Пры другім налёце нацыянал-сацыялістамі быў узят аўтамабіль Фэйхтвангера.

Паводле паведамленьня агенцтва «Рэйтар», нацыянал-сацыялісты ўварваліся ў адзін з рэстаранаў вядомай фірмы Кемпінскага, вынялі адтуль звыш 100 пісьменьнікаў і прымусілі адміністрацыю закрыць часова рэстаран.

Нацыянал-сацыялісцкі ўрад у Брэмэні

БЭРЛІН, 19. Урадавы ўпаўнаважаны свабоднага гораду Брэмэну прызначыў сэнат (урад) гораду ў складзе 6 нацыянал-сацыялістаў і трох членаў партыі нацыяналістаў.

Выступленьні новага старшыні рэйхсбанку Шахта

БЭРЛІН, 19. Бюро «Вольфа» паведамляе: «Новы старшыня рэйхсбанку Шахт выступіў з прамовай, у якой падкрэсьліў необходнасьць прывесьці валютную і кредытную палітыку ў адпаведнасьць з палітычнымі прынцыпамі ўраду. «Калі я пакінуў пасаду старшыні рэйхсбанку тры гады таму назад, — сказаў ён, — рэйхсбанк меў золата і дэвізаў на суму 3,3 млрд. марак. На сёньняшні-ж дзень у яго застаецца толькі адна дзевятая частка паказанай колькасьці. Необходна прыняць усе меры, каб зноў павялічыць запасы золата і дэвізаў, трэба запэўніць заграніцу ў тым, што мы поўнасьцю прызнаем нашы камэрцыйныя даўгавыя абавязацельствы. Рэйхсбанк будзе аказваць падтрыманьне ўсякім пачынаньням у галіне разьвіцьця вытворчых магчымасьцяй Германіі і будзе заахвочваць ініцыятыву кожнага дробнага гандляра, фабрыканта, зямельнага ўласьніка, паколькі рэарганізацыя буйных канцэрнаў аказалася шкодная. Аднародная мэтаймкнёнасьць германскага ўраду і рэйхсбанку забясьпечыць іх супрацоўніцтва ў галіне фінансаў, банкаў і кредытаў».

* * *

БЭРЛІН, 19. Былы прэзыдэнт рэйхсбанку **Лютэр** прызначаецца германскім паслом у ПАЗШ замест падаўшага ў адстаўку Прытвіца.

Супроць фашысцкага тэрору ў Германіі

Адозва перадавой чэскай інтэлігенцыі

ПРРАГА, 19. ЦК кампартыі Чэха-Славакіі выпусьціў адозву, якая заклікае пралетарыят Чэха-Славакіі, без роснасьці партыйнай прыналежнасьці, **выступіць з патрабаваньнем вызваленьня пралетарскіх зьняволеных Германіі, перш за ўсё Тэльмана і Торглера.** «Лева фронта» публікуе заяву, у якой перадавая інтэлігенцыя Чэха-Славакіі, у тым ліку прафэсары **Няедлы, Вінтэрніц** і інш., пісьменьнікі **Шальда, Нэймэн** і інш., калектыў **«Асвабадзена Дывадло»** (Вызвалены тэатр) і саюз сацыялістаў архітэктараў падкрэсьліваюць, што фашызм у Германіі пагражае ня толькі людзкому жыцьцю але і культуры і мастацтву германскага народу. «У баёх супроць рэакцыі наша месца побач з пралетарыятам—адзінай клясай, якая вырашае лёс сьвету»—гаворыцца ў заяве.

* * *

Н'Ю-ЁРК, 17. У Філядэльфіі адбылася антыфашысцкая дэманстрацыя перад будынкам германскага консульства. Паліцыя разагнала дэманстрантаў. 7 дэманстрантаў арыштавана.

ФАШЫСЦКІ ТЭРОР У АЎСТРЫІ

Сутычкі рабочых з паліцыяй

ВЕНА, 19. Ва ўсёй краіне працягваецца прывядзеньне паліцыі і войск у баявую гатоўнасьць. Грамадзкія будынкі ахоўваюцца моцнымі вайсковымі часьцямі, у рабочых кварталах гарадоў пачынаюцца вобыскі. У радзе раёнаў хэймвэрскія атрады выконваюць усе функцыі дапаможнай паліцыі. Адпоўлена адпраўка хэймвэрскіх атрадаў у **Вену.** Учора ва многіх мясцовасьцях **ніжняй і верхняй Аўстрыі і Штырыі** канфіскаваны былі склады зброі сацыял-дэмакратычнага саюзу абароны «Шуцбунд».

Абурэньне рабочых знайшло ўчора сваё канкрэтнае выяўленьне ў неаднаразовых сутычках паміж рабочымі з аднаго боку і паліцыяй і хэймвэрам з другога. У Бруке на Муры (Штырыя) сьледам за сутычкай паміж групам «Шуцбунду» і хэймвэру жандармэрыя арыштавала шмат шуцбундаўцаў, пасьля чаго прышоўшыя на дапамогу з суседніх мясцовасьцяй групы «Шуцбунду» і рабочыя з прадпрыемстваў акружылі жандармскую казарму. Толькі пасьля абстрэлу рабочых удалося вызваліць жандармскую казарму ад блёкады. У **Тыролі,** дзе мясцовыя ўлады выдалі распараджэньне аб роспуску арганізацыі «Шуцбунду», спробы ўлад правесьці гэта распараджэньне, паводле паведамленьня «Ротэ Фанэ», пацярпелі крушэньне, бо яны сустрэлі рашучае супраціўленьне шуцбундаўцаў і рабочых. Ва ўсіх пэнтрах Тыролю шуцбундаўцы знаходзяцца ў баявой гатоўнасьці і катэгарычна адмаўляюцца ад выдачы зброі. Кіраўнік тырольскай арганізацыі «Шуцбунду» **Купрыян** арыштован па абвінавачаньні ў «дзяржаўнай здрадзе».

Учора адбылося скліканае паводле прапановы сацыял-дэмакратаў і нацыянал-сацыялістаў пасяджэньне саюзнага савету (другая палата, якая складаецца з прадстаўнікоў асобных правінцыяльных ляндтагаў і ўрадаў). Саюзны савет большасьцю галасоў прыняў сацыял-дэмакратычную прапанову зьвярнуцца да прэзыдэнта рэспублікі з патрабаваньнем процідзейнічаць антыканстытуцыйным дзеяньням ураду.

Нават два міністры, якія прысутнічалі з пачатку пасяджэньня, у знак пратэсту і крытыкі дзеяньня ўраду, пакінулі залю пасяджэньня. Саюзны савет большасьцю галасоў пастанавіў пасяджэньне працягваць. Афіцыёз «Райхспост» у сувязі з гэтым гіранічна заяўляе, што вотум недавер'я, вынесены саюзным саветам, ня турбуе ўрад.

КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫ ЛЯГЕР І ПАЖЫЦЬЦЕВАЯ КАТАРГА ДЛЯ КАМУНІСТАЎ

Новы закон фашысцкага ўраду Румыніі

ВЕНА, 15. Як паведамляюць з **Бухарэсту,** румынскі парлямант прыняў галасамі нацыянал-царанісцкай большасьці законапраект пра абвастраньне ў адносінах да камуністаў закону аб абароне дзяржавы, выданага ў 1924 годзе урадам Тратыяну. Новы закон прадугледжвае павышэньне пакараньняў аж да пажыцьцёвага зьняволеньня, а таксама магчымасьць ізаляцыі ў канцэнтрацыйным лягеры і высылкі актывістаў рэвалюцыйнага руху.

ПОЛЬШЧА ЎМАЦОЎВАЕ ВЭСТЭРПЛАТЭ

БЭРЛІН, 19. Па паведамленьні данцыгскага карэспандэнта «Дэйчэ Альгемайнэ цэйтунг», 18-га сакавіка паліцэй-прэзыдэнт Данцыгу паведаў Вэстэрплатэ. Па вестках карэспандэнта, Польшча ўмацоўваецца там, ужо быццам узьведзены дротавыя загароды і выкапаны акопы.

Данцыгскі сэнат забараніў сьвяткаваньне імянін Пілсудзкага

Як падае віленскае «Слова», данцыгскія ўлады забаранілі ўсякія сходы палітычнага характару на тэрыторыі Данцыгу і Цопот.

Адначасова данцыгскі сэнат (урад) паведаміў генэральнага камісара Польшчы, што з прычыны палітычнага характару ўрачыстасьцяй з аказіі імянін Пілсудзкага (19 сакавіка), урачыстасьці гэтыя адбыцца ня могуць.

(Уласн. інф.).

КПФ СТВАРАЕ АДЗІНЫ ПРАЛЕТАРСКІ ФРОНТ

Сацыялістычныя рабочыя пераходзяць пад сьцяг кампартыі

ПАРЫЖ, 16. Як паведамляе «Юманітэ», заклік кампартыі Францыі аб стварэньні адзінага пралетарскага фронту для барацьбы супроць фашызму і супроць наступленьня капіталу на жыцьцёвы ўзровень працоўных выклікаў шырокі водгук сярод рабочых сацыялістаў. Арганізаваны кампартыяй 8 сакавіка мітынг у Парыжы сабраў 8 тыс. слухачоў, сярод якіх было таксама нямала рабочых сацыялістаў, цалкам ухваляючых лёзунгі кампартыі аб барацьбе з вэрсальскім дагаворам і салідарызацыі з працоўнымі Германіі. На мясцох сацыялісцкія арганізацыі, не падпарадкоўчыся свайму кіраўніцтву, прыступаюць да абгаварэньня пралановаў кампартыі аб стварэньні адзінага фронту. Арганізацыя сацыялісцкай партыі ў дэпартамэнце Сены прыслала свайго спэцыяльнага прадстаўніка, каб сарваць сход, аднак, вялізарнай большасьцю рабочыя прынялі пастанову аб стварэньні адзінага фронту.

РАШУЧАЕ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КІТАЙСКІХ ВОЙСК

Японцы страцілі 86 забітымі 122 параненымі

МУКДЭН, 19. Мяркуючы па японскіх паведамленьнях, баі ў раёне Сіфынкоу былі, відавочна надзвычай жорсткімі і суправаджаліся вялікай колькасьцю ахвяр. Згодна паведамленьня агенцтва «Кокуцу», японская брыгада **Хаторы** па працягу апошняга часу мела 5 сутычак з кітайскімі ўзброенымі. Брыгада страціла **86 чалавек забітымі і 122 параненымі.** Японскі атрад Даротодзі быў з сакавіка цалкам зьнішчан у бойцы ў Фанцзякоу (на поўнач ад Сіфынкоу). Значнай перашкодай для ваенных апэрацый японскіх войск зьяўляецца наступленьне аддзілі і бездарожжа, з-за чаго снабжэньне войск можа быць праведзена толькі самалётамі.

* * *

ТОКІЁ, 19. Як паведамляе агенцтва «Сімбун Рэнго» з Сыфынкоу, кітайскія часьці, скончыўшы ўмацаваньне пазыцый у раёне Ванцзякоу, 18 сакавіка пачалі атаку супроць японскіх часьцей каля Сыфынкоу. Бой цягнуўся ўвесь вечар і яшчэ не закончан.

* * *

МУКДЭН, 20. Становішча на фронце каля Вялікай сьцяны а таксама ў Шанхайгуані застаецца, як і раней, надзвычай напружаным. Паведамляюць, што кітайскія часьці пабудавалі добра ўмацаваныя акопы ў раёне Сыфынкоу і на захад ад Шанхайгуаню. У японскіх паведамленьнях указваецца, што кітайскія часьці, зьмешчаныя на правым беразе ракі Шыхэ, абстрэльваюць японскія каравулы ў раёне Шанхайгуаню. Японскія ваенныя паведамленьні указваюць, што японскім часьцям надзвычай цяжка ажыцьцявіць поўны кантроль над усімі праходамі каля Вялікай сьцяны і што кітайскія войскі прасочваюцца ў правінцыю Жэхэ праз шматлікія вузкія праходы ў Вялікай сьцяне.

* * *

ТОКІЁ, 20. Як паведамляе агенцтва **«Сімбун Рэнго»,** часьці з брыгады Хаторы 19 сакавіка занялі **Саньхэцяо,** за 14 кілёмэтраў на захад ад Сыфынкоу (па той бок Вялікай сьцяны). Паводле слоў агенцтва, часьці Сун Чжэ-юаня, якія прабавалі на працягу апошняга тыдню некалькімі атакамі ўзяць Сыфынкоу, пасьля захопу Саньхэцяо адступілі на паўднёвы ўсход уздоўж ракі Луанхэ.

Барацьба працоўнага сялянства ў капіталістычных краінах

ПАЗШ. У штаце МІЧЫГАН, перад будынкам суда, паліцыя разагнала з дапамогай сьпэцыяльных бомбаў дэманстрацыю фэрмэраў, якая прабавала перашкодзіць продажы з таргоў маемасьці збанкрутаваных фэрмэраў.

«ТАСС»

* * *

АЛЖЫР (Афрыка) Барацьба алжырскіх сялян за сваю зямлю прадстаўляе сабой добры прыклад калектыўнага дзеяньня.

Фэлахі (алжырскія сяляне) сваімі рашучымі дзеяньнямі і дэманстрацыямі на вуліцах Бліды прымусілі ўрад адступіць ад намераў забраць у фэлахаў зямлю пад відам необходнасьці новых дрэванасаджэньняў.

Сяляне-тубыльцы Сідзі Намуда пастанавілі прыступіць да апрацоўкі зямляў, якія лічыліся забранымі. Яны ад мовіліся плаціць штрафы і сабраўшы штрафныя лісты, пастановы аб канфіскацыях і розных спагнаньнях, парашылі перадаць іх праз сваіх дэлегатаў уладам.

У іншых раёнах Алжыру (ПАЛЕСТРА, АРБАТ, РЭНОЛЬД, МАРМА), дзе «левы» ўрад арганізаваў у шырокім маштабе канфіскацыю земляў сялян, апошнія, бяручы прыклад з фэлахаў Бліды, уступілі ў барацьбу за абарону сваіх вучасткаў.

Фэлах мае супроць сябе ня толькі забіваючы яго імпэрыялізм, але і бліжэйшых саюзьнікаў і слуг імпэрыялізму: каіда, фэадалаў, баяр і партыю «СФІЕ», якая нікопі нічога не зрабіла, каб абараніць тубыльцаў-сялян.

Абаронца працоўных—кампартыя, рашуча ўзялася за абарону фэлахаў і арганізуе барацьбу супроць экспропрыяцый іх, супроць падаткаў, штрафаў, пяснога кодэксу, за бясплатнае насеньне, бяспроцантныя крэдыты і інш. для бяднейшых сялян.

Сяляне ўсяго Алжыру ведаюць, што толькі дзякуючы кампартыі іх таварышы ў Блідэ мелі посьпех у барацьбе. Вялікі камуністычны прадстаўнічы групоўцца сотні фэлахаў для абмеркаваньня мер барацьбы супроць іх клясавых ворагаў.

Посьпех гэтай барацьбы залежыць ня толькі ад аб'єму і сілы руху фэлахаў, але таксама і ад падтрыманьня, якое яму акажуць рабочыя Алжыру і Францыі.

«Юманітэ».

Аб ходзе рамонту трактараў

ПАСТАНОВА СНК БССР І ЦК КП(б)Б

1. СНК БССР і ЦК КП(б)Б канстатуюць, што ў пазаўчасьці ёсьць усе ўмовы для скончэньня рамонту трактараў у тэрмін, устаноўлены ЦК, — 25 сакавіка.

2. Папярэдзіць дырэктароў усіх трактарацэнтраў і прамысловых аб'яднаньні, Наркамзем, упаўнаркамсаўгасаў, усе РК і РВК, што пры пазаўчасьці ўсіх гэтых умоў, яны абавязаны выкапаць пастанову ЦК, знакі у дачыненьні да іх з боку ЦК і СНК будуць ужыты меры рашучага ўзьдзеяньня.

3. Лічыць необходным правесьці праверку ўсіх трактараў, што выпускаюцца з рамонту, з абкаткаю на мейш 3-5 гадзін, прыступіўшы да гэтай праверкі неадкладна і закончыўшы яе не пазьней 10 красавіка. Для гэтай мэты скласьці камісію ў складзе прадстаўнікоў Трактарацэнтру, НК РСІ, ДПУ і мэханіка.

4. Прапанаваць т. Фрумкіну вылучыць для гэтай мэты 10 мэханікаў, а Аўтадору — 5, астатнюю частку мэханікаў прыцягнуць з МТС і МТМ з тым, што яны прымаюць удзел у камісіі па праверцы трактараў, што выпускаюцца з рамонту суседнімі МТМ і МТС.

Лекцыі А. А. Папова

Прыехаўшы ў Менск лектар **А. А. Папоў** правядзе па клюбах рад кінолекцый на розныя сацыяльна-эканамічныя тэмы. Лекцыі А. А. Папова, добра вядомага рабочай аўдыторыі Данбасу, Баку і інш. прамысловых цэнтраў, заўсёды праходзяць з вялікім посьпехам.

Жывы і яркі выклад у спалучэньні з сур'ёзным аналізам эканамічнага і палітычнага становішча ў розных капіталістычных краінах забясьпечваюць лектару нязменны посьпех у слухачоў, незалежна ад ступені іх падрыхтаванасьці. Цікавасьць лекцый заключаецца яшчэ ў тым, што яны ў значнай меры заснаваны на асабістых назіраньнях і ўражаньнях лектара.

Лекцыі ілюструюцца добра зробленымі дыяпазытывамі і кіно-істужкамі.

Гэтымі днямі адбылася першая лекцыя тав. Папова ў клюбе харчавікоў. Необходна, каб усе клюбы гораду шырока выкарысталі прыезд папулярнага лектара.

Г.

АДЭШЧЫНА І ДНЕПРАПЯТРОЎШЧЫНА ПАЧАЛІ СЯЎБУ

АДЭСА, 19. Мікалаеўскі раён Адэшчыны закончыў звышраньнюю сяўбу. Замест 600 га паводле пляну, засеяна 800 га.

* * *

ХАРКАЎ, 19. На Днепрапятроўшчыне сяўба пачалася ў Генічаскім, Новатроіцкім і Маскоўскім раёнах. Сяўбу таксама пачалі 22 калгасы Тыраспольскага, Слабодзейскага і Грыгарапаліска га раёнаў, якія ўжо засеялі 369 га ячменю і пшаніцы.

* * *

ЗАПАРОЖЖА, 19. Камуна «Гігант» першай на Запарожжы прыступіла да ачысткі палёў ад пустазельля. Вытворчыя брыгады за два дні ачысьцілі плошчу ў 180 га. Работа працягваецца паскоранымі тэмпамі.

НОВАЯ ТЭЛЕФОННАЯ УСТАНОЎКА

МАСКВА, 19. Інстытут сувязі НКШЗ упяршыню ў сьвеце ўводзіць тэлефонную ўстаноўку, якая дазваляе восьці па жалезных праводох замест адзэй гутаркі дзьве. Новая ўстаноўка будзе абслугоўваць тэлефонную чыгуначную лінію Масква-Разань-Казлоў.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Народны Камісарыят Асьветы БССР і Беларускае Аб'яднаньне Культтавараў „БАКТ"
папярэджваюць ўсе райана, школы, тэхнікумы і ВНУ, што калі **ЗАЯЎКІ** на наглядныя дапаможнікі лябараторнага і палітэхнічнага абсталяваньня ня будуць прадастаўлены БАКТ'у **да 25 сакавіка,** гэтыя арганізацыі будуць зьняты з плянавага забесьпячэньня
Адказасьць за своячасовае забесьпячэньне прадстаўленьня заявак укладаецца персанальна на заг. райана.
Заяўкі прадстаўляць на адрасу: Менск, Рэвалюцыйная, 26, „БАКТ".
Наркамасьветы, БАКТ.

26 КАМІСАРАЎ

ЗУБАЛЯЧЭБНІЦА ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ
(Менск, Інтэрнацыянальная № 6)
паведамляе сваіх заказчыкаў, якія заказалі запатыя зубы ў 1931 і 1932 г. г., што **АПОШНІ ТЭРМІН** атрыманьня залатых заказаў і астачы золата— **1-га красавіка 1933 г.**
Пасьля указанага тэрміну заказы і астача золата выдавацца ня будуць.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

ТОРГСІН
гэтымі днямі, акрамя існуючых магазынаў,
АДКРЫВАЕ
)—(НАСТУПНЫЯ МАГАЗЫНЫ:)—(
1. ЛЕНІНСКАЯ, 10. па продажы: мяса, рыба-кансэрваў, фруктаў, малочных прадуктаў і гародніны
2. САВЕЦКАЯ, 24, дом Мяталіста. Універмаг— поўны асарты мант усіх тавараў
3. САВЕЦКАЯ, 127. Бакалейна-гастрэнамічны.
4. КАМУНАЛЬНАЯ, 31. Універмаг— поўны асартымант усіх тавараў.
АКРАМЯ ГЭТАГА
АДКРЫВАЮЦЦА НОВЫЯ СКУПАЧНЫЯ ПУНКТЫ
па прыёмцы
СРЭБРА І ЗОЛАТА:
1. Школьная, 2-1. 2. Савецкая, 80. 3. Савецкая, 24. 4. Савецкая, 127.
ТОРГСІН.

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ БССР
ПАТРЭБНЫ
НА СТАЛУЮ ПРАЦУ ў гор. Менску
Галоўны бухгальтар 1.
Бухгальтароў 2.
За спраўкамі зварачацца—Першамайская, 7, трэці паверх.
ЦК Чырв. Крыжу БССР.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)
Маст кіраўн. ЛІТВІНАЎ. Л. І П. ТУР.
СЁНЬНЯ **ЗЯМЛЯ І НЕБА** п'еса ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 г.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" КАСА—ад 1 г. дня **НАЕЗЬНІК** в УАЙЛЬД-ВЭСТА 2 серыі ў адзін сеанс.
1-шы дзіцячы гукавы кіно-тэатр КАСА—з 10 г. ран. Гукавая праграма 1) **БЯГЛЕЦ,** 2) Пераваз, якці наперад
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня Мастацкі фільм **ДАЧКА РАФКЭ**
ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі фільм **ЧУЖАЯ** Драма ў 6 ч.

„СПАРТАК" КАСА—ад 1 г. дня Мастацкі фільм **СЬВЯТА УНІРЫ** Кіно п'еса ў 5 частках

ДЗЕСЯЦЬ МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ
на санабарону і на аздараўленьныя мерапрыемствы дае
**2-